У краіне паэтаў

Au pays des poetes

У КРАІНЕ ПАЭТАЎ

AU PAYS DES POETES

Зборнік беларускай паэзіі

Collection de poésie biélorusses

ВЫДАННЕ
НА БЕЛАРУСКАЙ
І ФРАНЦУЗСКАЙ МОВАХ

EDITION BILINGUE
EN BELARUSSE ET
EN FRANÇAIS

MINSK МІНСК
EDITEUR ВЫДАВЕЦ
VIKTOR HURSIK **ВІКТАР ХУРСІК**

2011

УДК 821.161.3(82-1)(082.21)=133.1=03.161.3
ББК 84стд1-5.я43(4Беи)
У11

У11 **У кріне паэтаў**:Зб. бел. паэзіі. Выд. на бел. і франц. мовах=Au pays des poetes:Edition bilingue en belarusse et en français/Пераклі укл. Ніны Дзябольскай.–Мінск: Выд. В.Хурсік,2011.–384 с.–Парал. тыт. л.: франц.–30 паэтаў.
ISBN 978-985-6888-67-3

Кніга змяшчае творы трыццаці беларускіх паэтаў на беларускай мове, а таксама пераклады гэтых твораў на французскую мову. Сярод аўтараў М. Багдановіч, В. Вітка, С. Грахоўскі, Ул. Караткевіч, П. Панчанка, і інш.

УДК 821.161.3(82-1)(082.21)=133.1=03.161.3
ББК 84стд1-5.я43(4Беи)

© Ніна Дзябольская, укладанне, пераклад, 2011
© Выдавец Віктар Хурсік, афармленне, 2011

ISBN 978-985-6888-67-3

Ад перакладчыка

Маё знаёмства з сучаснай беларускай паэзіяй адбылося некалькі гадоў таму назад у Ракуцёўшчыне (размешчана сярод незвычайна прыгожых краявідаў Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці) на "Днях паэзіі", якія былі натхнёна арганізаваны супрацоўнікамі літаратурнага музея Максіма Багдановіча. Адразу ўразілі трапяткія адносіны ўсіх выступоўцаў да роднай мовы, іх бязмежная любоў да Радзімы, бесперапынная сувязь з вытокамі і прыхільнасць да паэтычнага таленту Максіма Багдановіча.

На адной з паэтычна-практычных канферэнцый музея даведалася, што яго вершы перакладаліся на англійскую мову. Чаму не на французскую? Рашыла паспрабаваць. І была здзіўлена таму, як лёгка пры даслоўным перастварэнні беларускіх вершаў на, здавалася б, далёкую раманскую мову дасягаецца рыфма.

Пасля да чарговай працы мяне падштурхнуў Сяргей Панізнік, папрасіўшы перастварыць "Косты" Рыгора Барадуліна, прапанаваныя на Нобелеўскую прэмію. І з гэтага часу Сяргей Сцяпанавіч дзяліўся са мной асабістай бібліятэкай, дасылаючы кнігі другіх аўтараў. Удзячна яму і ўсім паэтам, якія падарылі мне свае зборнікі. Адгортваючы чарговую кнігу, я кожны раз у захапленні: "І ў гэтага паэта свой почырк!" Які глыбокі сэнс нясуць так лёгка перастворaныя ў рыфму "Ахвярынкі" Рыгора Барадуліна, здзіўляючыя сваёй сцісласцю і ёмістасцю:

Прафесіяй рабіць не трэба злосць,
Прафесій іншых шмат на свеце ёсць.

Або:

Я да скрону заручаны з той стараною,
Дзе мама, як зорка,
Стаіць нада мною".

Здаецца, што мне дадзены вялікі гонар – мець магчымасць перастварацъ такую высокую паэзію. Імя Васіля Віткі, напрыклад, значыцца ў Ганаровым спісе дацкага Казачніка. Але яшчэ да таго, як я адважылася перакласці адну з яго паэтычных казак, звярнула ўвагу на іранічнасць "Пакаяння Праметэя", які ўкраў для нас, нявольнікаў тэлеэкрана, блакітны агеньчык:

Калі тварыў ты свайго Адама,
Яшчэ не маючы практыкі,
Тады не было ў цябе ні праграмы, ні плана,
Ні чарцяжоў Галактыкі.

Асабліва палюбіліся мне "Пункціры", ці як сам аўтар сцвярджае – "дотыкі" – Алеся Разанава. Усе яны лёгка рыфмуюцца ў французскім варыянце, нават калі ў арыгінале гэта белыя вершы:

Афарбавалі ў парку
Замшэлы валун –
І памерлі стагоддзі.

Інтымная лірыка ўсіх без выключэння беларускіх паэтэс прываблівае сваёй шчырасцю і непасрэднасцю:

Мы радуемся, ходзім рана.
У бары зязюленькі "ку-ку".
Пяць пальцаў, нібы пяць маланак.
З плячэй, прашу я, – скінь руку.

А радкі яшчэ адной паэтэсы так і хочацца запомніць і зрабіць сваімі:

Дам табе высокую пасаду –
Будзь майго бяссоння вартавым.

Вядома, што французская мова больш сціслая, чым руская, але беларуская яшчэ больш канкрэтная ў адрозненні ад французскай і, па-мойму, у нечым больш тонкая і

выразная за рускую, і валодае нейкім асаблівым шармам. Нядаўна пайшла ад нас у іншы свет таленавітая паэтэса і перакладчыца Ніна Мацяш, якая цудоўна пераклала на беларускую мову паэтаў Плеяды. Магчыма, што гэтыя дзве мовы маюць нейкую ўнутраную сувязь. Ва ўсякім разе, сам працэс перастварэння вельмі цікавы: узнікаюць меладычна сугучныя склады, якія адсутнічаюць у арыгінале ("Перакладаю шэпт дажджу"), з'яўляецца магчымасць знайсці некалькі сінонімаў для аднаго дзеяслова ("Хапіце міг"), што робіць дынамічным і без таго хуткі тэмп верша. Бывае і такое, што напрошваецца нечаканая рыфма. Спадзяюся, што беларускія салаўі даруюць мне жаданне развучваць "Карманьолу".

Гэты зборнік не прэтэндуе на паўнату анталогіі, чытач пройдзецца па нешматлікіх дарогах і жывапісных сцяжынках вялізнага прыгожага лесу беларускай паэзіі. Упэўнена, што ўсім, хто валодае французскай мовай, будзе цікава адкрыць для сябе філасофскую глыбіню, шчырую лірычнасць і неардынарнасць сучаснай паэзіі мала вядомай у літаратурным свеце краіны Беларусь.

Гэтыя пераклады ў значнай ступені былі б неажыццёўлены без высока прафесійных кансультацый паэта-перакладчыка Івана Бурсава, які ўзначальвае ў "Литературной газете" рубрыку "Два века белорусской поэзии".

У падрыхтоўцы гэтага двухмоўнага выдання шмат папрацавала нястомная і энергічная беларуская паэтэса *Вера Буланда.*

Ніна Дзябольская,
Масква, жнівень, 2011

EN BELARUSSE

ВАЛЯНЦІНА АКСАК

ВОСЕНЬСКАЯ НОЧ У МЕНСКУ

Magie noire
як сполахі дажджу
на набярэжнай Сены,
але па стомленым
адным паэтам нашым
горадзе
я болей не хаджу,
і мне Парыж
ня трэба сёньня.
Я набярэжнай Сьвіслачы
хаджу,
і тут мне водар
Magie noire,
як сполахі дажджу
пад пэндзлямі
якіхсьці там
імпрэсіяністаў.

ДАЛЬТАНІЧКА

Шэрая-шэрая,
аднастайна шэрая
насоўваецца на мяне
мая краіна
з-за Бугу,
з-за мяжы…
О, Божа,
шэрая-шэрая,
невымоўна шэрая…

А вясёлкавая
ці ўцячэ ад мяне
да мяжы
з-за Сьвіслачы..

ТРОХКУТНІК

Дзьве паэткі
адначасна пішуць
лісты з прызнаннямі
да аднаго і таго ж
мужчыны,
таксама паэта,
а ён па чарзе
рэдагуе
іхнія кніжкі.

ДЫЯЛОГ З НАРОДНЫМ ПІСЬМЕННІКАМ

– Валя,
чаму ты такая сумная,
у цябе ж знакаміты муж?
– Дарагі дзядзька Янка,
вашую жонку вясёлай
я таксама
ніколі
ня бачыла…

ЗАЦЬМЕНЬНЕ

Ты,
як той нахабны Месяц,
які наважыўся

засланіць Сонца,
каб у гэтым зацьменьні
я ўпэўнілася,
што апроч цябе
ў маім небе
нікога няма.

ЯК ГЭТА?

Як гэта так стаецца,
што цела тваё мажное
раптам губляе
ўсялякую важкасьць,
і толькі
дотыкі рук
істоту маю
ўмомант жарсную
асьцюжаюць?

НІХТО...

Саджу рэмантантныя ружы,
але ніхто не прыходзіць дзівіцца
на іх нетутэйшую гожасьць.

Шыю фасоніста сукно,
але ніхто не прыходзіць дзівіцца
на маю стрункастаннасьць у ёй.

Пяку задушэўныя дранікі,
але ніхто не прыходзіць дзівіцца
на гасьціннасьць маю невыводную.

Мама – зь Дзядамі.

ЭДУАРД АКУЛІН

МАЎЧАНЬНЕ ГОСПАДА

Перад брамай у храм Божы
зьбянтэжана адключаю тэлефон,
каб нават слабой вібрацыяй
не патрывожыць
маўчаньне Госпада,
не парушыць
урачыстую цішу Веры.

МАДОННА

Я твой партрэт пісаць баюся:
ты кожны момант – рух бясконцы.
Ад зайздрасьці цьмянее сонца
перад мадоннай з Белай Русі.
Я твой партрэт пісаць баюся,
хоць кожны рух твой п'ю вачыма...
Што мёртвыя мадонны Рыма
перад жывою з Беларусі?!

ЯБЛЫНЯ

У яблыні – ранімая душа,
Калі салавей ёй здрадзіць –
туман прыпаўзе з лаўжа
хаўтуры Каханьня ладзіць...

Па яблыку ў яблыні сьлёзы
спадаюць у жвір нябёсаў.

***

Туман у снежні –
варажба...
Ці насланьнё,
ці адзінота?
Ён першы снег не зневажаў.
Ён проста быў, як я, маркотны.

Ён проста крочыў наўздагад
і пераблытаў поры ў годзе...
Туман, табе я сёньня рады –
ты мой таварыш па самоце.

ВЯЧЭРНІ ЭЦЮД

Мёрзкае, халоднае акно.
Церпкае гарачае віно.
Келіх у руках гарыць,
падобна неонавай трубцы.
Кельнер-пінгвін
з разлікам марудзіць –
красуецца.
У шаліках, як самазагубцы,
спяшаюцца людзі па вуліцы.

МУЗЫКА

I

А потым, пасля як-небудзь
памяць па складу рэха
азавецца раптоўнай у нас.
Не раз,
не два
і не тры...
Слёзы не варты твару.

Трэба ўмець спатоліць –
нават калі ад болю.
Прыгожае не зьнікае, –
яго забірае вечар...
Неадольнае нас нявечыць.

II

У лесе сьвечак жыў туман...
Чаўном у вечнасць сплыў арган.

ЗЬДЗІЧЭЛЫ САД

Зьдзічэлы сад, як племя іудзеяў,
насуперак асеньняй Кабале
у сьвет, як у пустэчу, па надзею
пайшоў з цярноўнікам-Майсеем на чале.

Съляпым паглядам молячы абсягі,
карэньнямі абмацваючы дол,
брыдуць скрозь восень яблыні-бадзягі,
сузор'і яблык сеючы наўкол.

І на мяжы адчайнае зьнямогі,
спаймаўшы ў кроны віфліемскі дым,
перажагнуўся тройчы на дарогу
зьдзічэлы сад і стаўся залатым.

ЗАХАД

Туды не патрэбна візы.
Там лётае бусел нізам.
Пад хмарным крылом абвіслым,
там на абгарэлых выспах
дзядоўнік праменьняў высах.
І сонца патылак лысы
у зорны хавае прысак.

НЯ ТАК

Нешта ў сьвеце гэтым ня так...
Храм разбурылі – зрабілі вятрак.
І з той пары ў наіўных людзей –
вечар бяз хлеба і дзень без надзей.

ПРОСЬБА

О Леафан,
падводны цар,
нямы дазорца акіяну,
глыні мой сон,
бо з ім я сам
жыву у нераце падману.
Мой сон глыні
і ляж на дно,
як глыбіня сярод глыбіняў,
засьні на Вечнасьць,
мо тады
мяне той страшны сон пакіне,
што я адзін,
што ў цемры я,
а тая цемра – лона маці,
а маці тая – не мая,
мяне ня хоча нараджаць... І
я ненароджаны жыву
адзін у бездані Сусьвету,
і плачу я,
і я плыву,
як Ной,
згубіўшы ў моры мэту...

О Леафан,
падводны цар,
глыні мой сон
і кань у Лету.

ПАМІЖ

Сусьвет, як жорны,
перамеле ўсіх
на зорны пыл,
на мліва-пацяруху.
Сусьвет – як жорны...
Бог-млынар адзін,
заўжды адзін
між Вечнасьцю і Скрухай.

АБЯЦАНЬНЕ

Аднойчы Вечнасьць разамкнецца
між берагоў крутых жыцьця,
і першы, хто табе ўзаб'ецца
на вочы, Край мой, буду я.
Я так люблю цябе аддана,
што й на бярозавым крыжы,
што і з магільнага кургана,
што й з тагасьветнае цішы
здалею выплакаць, як пацер,
тры словы сьветлыя з душы:
Страцім, Паэзія і Маці –
дзеля чаго я ў сьвеце жыў...

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

Оглянись – и мир вседневный
Многоцветен и чудесен.
А. Фет

Прывет табе, жыццё на волі!
Над галавой – дубоў павець,
Віднеюць неба, горы, поле
Праз лісцяў сець.

Лахмоцці ценяў на палянах,
Схаваўшы золата, ляжаць;
Яго слаі з-пад дзір парваных
Аж зіхацяць.

А к ночы свой чырвоны веер
У небе сонца развярне,
І разварушаны іх вецер
У даль памкне.

Калі жа пабляднее золак,
І цёмнай зробіцца вада,
Заззяе серабром іголак
Зор грамада.

І роўна мілымі зрабіцца
Здалеюць яркі блеск і цень,
Той дзень, што мае нарадзіцца,
І знікшы дзень.

***

Ціха па мяккай траве
Сінявокая ноч прахадзіла;

Ціха з заснуўшых палян
Плыў у гару і знікаў,
Быццам дым сіняваты з кадзіла,
Рэдкі, правідны туман;
Неба ўсю глыб ажывіўшы,
Патроху праз цемнь выглядалі
Зорак дрыжачых вянкі;
Конікі суха звінелі;
Шырэй разліваліся хвалі
Цёмнай, люстранай ракі;
Пала раса; у палёх
Загараліся пацеркі мілых
Жоўта-чырвоных агнёў…
Час, калі трэба журыцца
Душой на свежых магілах
Пуста пранёсшыхся днёў.

РАНДО

Узор прыгожы пекных зор
Гарыць у цемні небасхіла;
Вада балот, стаўкоў, азёр
Яго ў глыбі сваёй адбіла.
І гімн спявае жабаў хор
Красе, каторую з'явіла
Гразь луж; напоўніць мгла прастор,
І ўстане з іх гарашчы міла
Узор.
І сонца дальш клянуць, што скрыла
Луж зоры днём. І чуе бор,
І чуе поле крэхат хілы,
Ды жаб не ўчуць вышэй ад гор
Там, дзе чыясь рука зрабіла
Узор.

***

У небе – ля хмары грымотнай – празрыстая, лёгкая хмара
Шпарка плыла, і абедзве чагось чырванелі ад жару.
Зліцца жадалі яны, зрабіліся б хмарай магутнай,
Але далёка іх вецер разнёс, наляцеўшы нячутна.

Дробным дажджом над зямлёй, як слязамі, адна пралілася;
Гулкім раскатам грымотаў другая ў адказ азвалася.
І паасобку загінулі хмары бяздольныя тыя,
Чуючы ў небе, як вецер над смерцю іх радасна вые.

АКТАВА

Як моцны рэактыў, каторы выклікае
Між строк ліста, маўляў нябожчыкаў з магіл,
Рад раньш нявідных слоў, – так цемень залівае
Зялёны, быццам лёд, халодны небасхіл,
І праз імглу яго патроху праступае
Маленькіх, мілых зор дрыжачы, срэбны пыл.
Здароў, радзімыя! Мацней, ясней гарыце
І сэрцу аб красе прыроды гаварыце!

СЛУЦКІЯ ТКАЧЫХІ

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.
А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна, –
І думкі мкнуцца мімаволі

Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам зззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора…
І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага узора,
Цвяток радзімы васілька.

***

Учора шчасце толькі глянула нясмела, –
І развеяліся хмары змрочных дум.
Сэрца чулае і млела, і балела,
Радасць душу мне шчаміла, быццам сум.

Ўсё жыццё цяпер, як лёгкая завея,
Кнігу разгарнуў – а не магу чытаць.
Як зрабілася, што пакахаў цябе я, –
Хіба знаю я? Ды і нашто мне знаць?

***

Не кувай ты, шэрая зязюля,
Сумным гукам у бары;
Мо і скажаш, што я жыці буду,
Але лепш не гавары.
Бо не тое сведчыць маё сэрца,
Грудзі хворыя мае;
Боль у іх мне душу агартае,
Думцы голас падае,
Кажа, што нядоўга пажыву я,
Што загіну без пары…
Прыляці ж тады ты на магілу,
Закувай, як у бары.

***

Ўсё праходзе – і радасць, і мукі,
Але будзеш мне помніцца ты –
Броўкі цёмныя, вузкія рукі
І галоўкі радок залаты.

СКІРПУСЯ

Ой, пайшла сабе Скірпуся на кірмаш
Паглядзець, ці селязенькаў нямаш, –
Мо варона, мо сава,
Мо Скірпусенька ўдава.
Прадала яна каня,
Ўтаргавала селязня,
Селязенька чубаценькага,
Маладога, зухаваценькага.
Пакупіўшы селязня,
Мела клопату штодня:
Селязенька умываецца,
Сам на вулку узіраецца;
Узіраецца на вулачку,
Ці не ўбачыць тую вутачку.
Селязенька – Івашачка,
Ён цалуецца з Наташачкай.

ТРЫЯЛЕТ

Красавец юный, Триолет
К. Фофанов

Як птушка ў гібкіх трасніках,
Стралою думка мільганула
І ўраз жа знікла, патанула,
Як птушка ў гібкіх трасніках,
Ды ўсё ж душа яе пачула

І ўжо пяе ў такіх славах:
“Як птушка ў гібкіх трасніках,
Стралою думка мільганула”.

ТРЫЯЛЕТ

Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асляпіла вочы.
Ды што мне цемень вечнай ночы,
Калісь глядзеў на сонца я.
Няхай усе з мяне рагочуць.
Адповедзь вось для іх мая:
Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асляпіла вочы.

МАЯ ДУША

Мая душа, як ястраб дзікі,
Што рвецца ў неба на прастор.
Вартуе вольных птушак крыкі, –
Мая душа, як ястраб дзікі.

Учуўшы іх, страсе вялікі
Свой сон, шыбне ды вышай гор, –
Мая душа, як ястраб дзікі,
Што рвецца ў неба на прастор!

ЗМЯІНЫ ЦАР

Цемень. Сосны. Елкі. Мох. Кара.
Смерць прыйшла ужо ка мне…
Разгарысь, вячэрняя зара,
У туманнай вышыне.

Цёмнай ноччу страшна у жальбе
Памірaць. Шуміць трава,
Глуха дзяцел ў дрэве б'е,
Гучна гукае сава.

А памрэш – прыціснуць грудзь пласты
Гліны. Ўстану ж на яру,
Падыму галоўку праз кусты,
Гляну ў неба і памру.

Скоціцца карона, пабяжыць
Залатая ў шэры мох.
Чорны кот магілу прыйдзе рыць.
Дрогне вецер на кустох.

Месяц брызне хваляй серабра,
Расой блісне ў нізіне…
Разгарысь, вячэрняя зара,
У туманнай вышыне.

ПУГАЧ

Загарэлісь кроўю вочы. Вось нясецца
З цёмнай елкі гук нуды і смеха,
І далёка голас аддаецца –
Пракацілася па лесе рэха.
І, лякаючысь, канца чакаеш ночы.
Ўсё здаецца: ўстаў лясун вялікі, –
Чырванеюць, адбіваюць кроўю вочы,
Не змаўкае смех глухі і дзікі.

НАД ВОЗЕРАМ

Сонца ціха скацілася з горкі;
Месяц белы заплаканы свеціць,

Аглядае бахматыя зоркі,
Цягне з возера срэбныя сеці.

Ў іх русалкі заблуталі косы, –
Рвуць і блутаюць срэбныя ніці;
Ноч плыве над зямлёй, сее росы,
Ноч шапоча русалкам: "Засніце".

НА ЧУЖЫНЕ

Вакол мяне кветкі прыгожа красуюць.
Маркотна між іх я хаджу адзінок,
Аж бачу – мне сіняй галоўкай ківае
Наш родны, забыты ў цяні васілёк.
"Здароў будзь, зямляча!" Чуць бачны ў даліне
Панура, нявесела шэпча ён мне:
"Ўспамянем, мой дружа, ў багатай чужыне
Аб беднай, далёкай сваёй старане".

НОЧ

Ціха ўсё была на небе, зямлі і на сэрцы…
Ноч цемнатою навокала ўсё пакрывала,
Ясныя зоркі блішчалі, і месяц ўжо выплыў,
Неба, і лес, і палі серабром аблівая.
Ўсё ўжо уснула, і толькі бярозы шапталіс,
Толькі асіны шумелі, і толькі калоссі,
Ў полі шырокім качаясь, зямлю цалавалі.
Ціха ўсё была на небе, зямлі і на сэрцы…

МАЕ ПЕСНІ

I

Калі смутак моцна дзьме душу маю,
І шкада мне дзён загубленых сваіх, –

Я паціху песні сумныя пяю,
Ўсю жуду сваю выкладваю ў іх.
Ціха песня разліваецца, звініць,
Вымаўляе, як я моладасць згубіў,
Як дагэтуль не патрапіў палюбіць,
І саўсім, бадай, праўдзіва шчэ не жыў.

II

А як родную згадаю старану,
Як згадаю яе беднасць і нуду, –
Сэрца сціснецца, і я пяяць пачну, –
Мо душу хоць трохі гэтым адвяду.
Грозна песня разліваецца, грыміць,
Долю горкую, мужыцкую кляне,
Бо нявідзімы ланцуг на іх вісіць,
Бо ім цяжка жыць у роднай старане.

***

Добрай ночы, зара-зараніца!
Ўжо імгла над зямлёю лажыцца,
Чорнай рызай усё пакрывае,
Пылам зор небасхіл абсявае.
Цішыня агартае мне душу.
Вецярок прыдарожную грушу
Ледзьве чутна варуша-калыша,
Міла бомы смяюцца у цішы,
Ціха срэбрам грукае крыніца.
Добрай ночы, зара-зараніца!

ПАГОНЯ

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, –
Ўспомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні, –
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць…
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

У бязмерную даль вы ляціце,
А за намі, прад намі – гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі уздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Біце ў сэрцы іх – біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць…

Маці родная, Маці-Краіна!
Не усцішыцца гэтакі боль…
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць…
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

РАІСА БАРАВІКОВА

ДЗЕСЯЦЬ ВАСЬМІРАДКОЎЯЎ

1

А пачыналася будзённа –
два тыдні падалі дажджы.
І ад работы той сезоннай
ля сцен шалелі капяжы.

Дражніў на шыльдачцы фанернай
«Мяне няма!" – кароткі сказ,
але было акно ў майстэрні
і дазваляла бачыць вас.

2

Без парасона, як заўсёды,
бы й не турбуе макрата.
Паэты часта пішуць оды
там, дзе патрэбна прастата.

І вы таксама? Адкажыце, –
звычайна пішаце мадон?
Што ж вы стаіце? Памажыце, –
прамоклы скінуць палітон.

3

Задума? Мара? Чыйсьці след?
Пытаннем паўжыцця мінула.
Дык што ж гняце, калі агулам
сабраць усё ў адзіны свет?

Не ведаю. Той свет – штукар.
Ці мала сцежак абабіла?

Як пачала яго шукаць,–
усё, што мела, разгубіла.

4

Да складных думак непрыдатны
вячэрні час – агнёў мігценне.
Што іншым бачыцца выдатным,
для вас – заўсёднае сумненне.

Бы родны брат сястры зласлівай, –
гатовы кроў мяшаць з чарнілам,
пішыце: "Зрання – ўсё няміла,
заснуць хацелася б – шчаслівым".

5

Магчыма, быў усплёск вясла…
А я з дажджу. Там – вецер, лужы.
Не лотаць мілую, а ружы
вам на сукенцы прынясла.

Не ў рукі. Шоўк бяруць рукамі,
да губ падносяць край няроўны,
тым больш што Той, якая ў раме,
відно па позірку – ўсё роўна.

6

Вы з тых, хто чарку п'е да дна,
Заве скарынку хлебам пышным.
Прыдумайце ў майстэрні лішніх,
каб засталася я адна.

Вунь палатно – ледзь бачны цень,
сказала б я – драпежнай зграі,
а гэта Памяць, што з дня ў дзень
мяне па ўсіх шляхах шукае.

7

Увайдзіце ў маё становішча, –
разліваюць хвіліны раку.
Можа мост разгарэцца вогнішчам,
вы – на тым, я – на гэтым баку.

Адзінота мая дасылае нізкі
да зямлі паклон на зарок –
хай жаданы ён, і адчайна блізкі –
не хадзіце вы на той бок.

8

Аднаму прыродай дадзена, –
хоць раскідвай на дваіх,
і жыве другі абкрадзеным,
у палёгку – ветру ўздых.

Не ўздыхайце. Вы не вецер..
Скарб пры мне – не ўзняць рукі.
Вам не трэба, – кіньце ў сеці,
што наткалі павукі.

9

Трывожных слоў няяркі бісер
любоўныя ўпрыгожыць сказы,
я вам аддаць хацела б – высі,
якім няма яшчэ і назвы.

Калі адмовіць доля ў хлебе
ў хвіліны жорсткіх перамен,
каб мне не ўскідваць рукі к небу, –
а да вашых цягнуць калень.

10

Бедамі дарогі мераць,
у вірах зямных шалець,
і калісьці мне павераць, –
прад бядой пасуе смерць.

Назавіцеся бядою, –
сёння, заўтра і пасля…
І не дасць ужо зямля
размінуцца вам са мною!

***

З твайго саду да мяне на агеньчык
Мікола Селяшчук, алей

У мяне палянка ёсць за садам,
многа там шыпшыны і травы,
дам табе высокую пасаду, –
будзь майго бяссоння вартавым.

Упадзе ў траву пялёстак клейкі,
задрыжыць расінка на плячы, –
адгукнуся голасам жалейкі,
каб не сумавалася ўначы.

Перадам з душы ўтрапёнасць слову,
што ірвецца спуджана здалёк,
у шыпшыннік, пад тваю ахову,
быццам саду лёгкі матылёк.

ЧЫРВОНАЯ ВІШНЯ

Згібеў Адам. Адгаравала Ева.
Бабулі Марфе сніцца боскі сад…
У кожнага сваё спакусы дрэва,
і свой ва ўсе часы нядрэмны гад.

Не восень гаспадыняю увішнай
ссыпае лісце грыўнямі ў раку…
Усохлая, адно што назва, – вішня,
як неспакойны сон на бальшаку.

Але з якою сілаю галінка
да сонца плод свой цягне
з-пад лісця, –
заморак, адзінокую крывінку,
бы самы найвялікшы цуд жыцця.

І ў час, калі спакойна спіць малая,
мне ўкрадлівае чуецца:
“Алё-о…?”
адтуль, дзе вішня пад лістом палае,
дзе ў нізкіх промнях свеціцца галлё.

Вячэрні водбліск для душы не лішні
аднолькава для добрых і для злых…
і лёгка мне здаля сачыць за вішняй,
і страшна ў нейкі момант страціць слых.

***

Там рос палын густы і горкі,
цяпер там талая вада,
і смех завучаны акцёркі,
і ў доме – чорная нуда…

А я зацiснула каменьчык
у кулаку, і, як раней,
іду свавольна на агеньчык,
і думаю: шпурнуць ці не?

І сэрца чуе, што не выйдзе
ніхто на гэты лёгкі стук,
і я дарую, я не ў крыўдзе,
я не хачу ні губ, ні рук.

І прыняла б за ўзнагароду,
каб толькі можна мне было,
за гэта цьмянае святло
аддаць наступныя ўсе годы…

***

Халодны вецер дрэў не скалане,
пад імі словы чуюцца другія,
і ўжо спакойна дыхалася мне,
ды раптам Вы –
ўстрывожанай стыхіяй.

Калі б хоць тры гады таму назад,
я зноў перажыла б – абвал, зацьменне,
а тут… такі натхнёны лістапад!
Мне замінае ўпершыню натхненне.

З якога ўздыму – бліснула сляза?!
Твар засвяціўся,
свет рэальны – гіне…
і ў позірку так рызыкоўна-сіне:
там трыста д'яблаў супраць Вас і за!

***

Калісьці ў зелень апрануцца дрэвы
і свет раслін пяройдзе на мажор,
запросіць салаўя на ўрокі спеваў
начы святлюткай месяц – дырыжор…

Пакуль жа ўсё размалявана ў вохру,
галіны жальбы ўспомнілі свае…
І ўжо сняжок пакінуў свой аўтограф
пад лаўкай, дзе прамень не дастае.

Ды гуд пчаліны, спеў і расцвітанне, –
усё не раз паўторыцца ізноў,
а ты, хто даў сустрэчу і расстанне,
гаворыш: не вяртаецца любоў…

РЫГОР БАРАДУЛІН

ХМАРНЫ НАСТРОЙ

Вечнасці ўлежна
У ціхасці вечара,
Вечару светла
Ад цьмяных агнёў.
Ходзіць апошняга цень
Ці Прадцечавы?
Плача крумкач
Ці сцюдзёны Анёл?

БАЦЬКА І СЫНЫ

Двух варанят нёс воран на спіне.
І ў аднаго спытаўся на аблуду:
– Ці будзеш так і ў старасці мяне
Насіць?
І той пракумкаў:
–Тата, буду.
І воран скінуў варанятка з неба.
Перш чым адказваць,
Добра думаць трэба.

Тады ў другога запытаў:
– Скажы,
Сваіх сыноў
Мне ў час прыносіць будзеш?
– Вядома, тата,
Ты ж мне не чужы.
Ты і ў іхніх крылах
Вышыню абудзіш.
І воран пестуна далей панёс,

Каб з небам заручыць
Крылаты лёс...

***

А не хапіла й дваццаці стагоддзяў,
Каб людства зразумела, для чаго
Гасподзь аднойчы
На зямлю прыходзіў,
На крыж паслаўшы
Першынца Свайго.

Саміх сябе пашматаваць гатовы,
Сабакамі зрабіўшыся,
Ваўкі.
І люталюды ў крылы
Рук Хрыстовых
Яшчэ ўганяюць кутыя цвікі.

І тым жыве душа,
Што верыць цуду.
Трымае кожнага ягоны кон:
Фаму – знявер'ем,
Здрадлівасцю – Юду.
Страх думае,
Што шчыры толькі ён…

ЯК СЯСТРУ

А душа,
Пакуль зноў зямная,
І не ўспомніць, які ўжо раз
Свет знаёмы запамінае,
Дзе сябе пазычае час.

За начлег у часовым целе
Часу доўг душа аддае.

І куды б зоркі ні паляцелі,
Не забудуць паклікаць яе.

У нябёсах свае падворкі.
Лёс ладзьбуе свой воз стары.
І душу пасылаюць зоркі
На зямлю,
Як сястру да сястры.

ЗАВОЗ

Генадзю Равінскаму

У млыне з сілікатнай цэглы
Як апошняе вытрасаюць.
Іскры белыя выкрасаюць
З зерня пад маразок набеглы.

І нясуць у мяхі на падводах –
Так нясуць хіба сонных дзетак.
Сумнай пляшкі зялёны ветах
Затрымаў самагонны подых.

Гулка.
Пыльна.
Завозна.
Золка.
Млын жыцця –
Ён таксама тлумкі.
Забярэш свае мукі клумкі,
Запыліўшы крыло анёлка.

Двор прапах, як млынар мукою.
Смачна квокча страха-чубатка.
З белай лысінкай жарабятка
Сыціцца трасянкай мяккаю.

НА ЎСКРАЙКУ ВЕЧНАСЦІ

Памяці Васіля Быкава

Талент – гэта праклён
Паласатага д'ябла.
Намагаецца плён,
Каб душа не азябла.

Талент – гэта палон,
Не ўцякаюць з якога.
Б'ецца ў краты вакон
Маладзік крутарога.

Талент – гэта амбон,
Дзе хацела б вініцца
За бязмозгліцу дзён
Старасць – смерці двайніца.

Талент – ранішні сон,
І яго прачынацца
Не прыспешвае кон,
Покуль рупіцца праца…

НІКОМУ

Дадому, сваты, дадому,
Паелі конікі салому,
А каля тыну крапіву…
(З вушацкай вясельнай)

Прамяністую,
Змрок даядае салому.
Цёмнаю крапівой парасла цішыня.
Халадней мне
На гэтым свеце штодня.

Ды на тым
Не бывае цяплей
Нікому…

ІМКЛІВА

Не хапала абсягу чалавеку
Спрадвеку.
Неруш пушчы дрымотнай
Спляжыў на лесасеку,
Валуновыя глыбы
Клаў падмуркам сядзібы,
Збавіў лес ад звяроў,
Збавіў рэкі ад рыбы,
І ад быдла буйнога,
І ад птаства драбнога
Ён ачысціў зямлю,
Не пытаючы ў Бога.

І зямлю, дзе пустэчай
Стала шчодрая ніва,
Ад самога сябе
Ачышчае імкліва.

***

Мы – толькі цені ісціны,
Якую
Адчуць дазволіў
Звышні на імгненне.
Свой век па-свойму
Кожны адвякуе.
Жыццё пад небам –
Ценяў мільгаценне.

Ці мы жывем,
Ці страх лагодзім,

Свой страх,
Што непазбежнаму слугуе?
Ці паміраем мы,
Ці адыходзім
З адной краіны ценяў
У другую?

НЕСКАНЧОНЫ

Пацвердзяць чарадзей і маг,
Чаго каштуюць
Кіў і мах.
І скажа блазен,
Змоўчыць мім,
Як цяжка быць
Сабой самім.
Ён нескончоны,
Гэты бой,
Парой любой
З самім сабой…

***

Спартанцы збіраліся на вайну –
Вайстрылі мячы,
Прымервалі латы.
З усімі стаў у шарэнгу адну
Спартанец нягеглы,
Падслепаваты.
– Куды ты, нашто ты
Такі на вайне? –
Спытаўся нехта.
Нябога прызнаўся:
– Як іншай карысці няма –
Аб мяне
Варожы затупіцца меч

Прынамсі.
І ў дні,
Калі душы падпальвае змрок,
Калі цяжарнее
Жахам калоссе,–
Прымаюць смерць
І паэт, і прарок,
Каб меней у ворага куль засталося!

ТАМ

Не адлучаўся я зусім
З вушацкай хаты анікуды.
Дратоў з'інелых перагуды
Мой цягнуць сум
З далёкіх зім.

І дні спяшаюцца ўпадбеж
Вярнуцца ў цішыню нязлую.
Там толькі,
Дзе душа начуе
І прачынаецца,
Жывеш…

ГОД ЦІ…

З сямі тых дзён,
Што Госпад свет тварыў,
Дзень кожны доўжыўся
Год ці стагоддзе.
І свет,
Нібыта ўзбегшы на абрыў,
Крычаў сабе самому:
Глухнуць годзе!

І свет наважыўся дагнаць свой цень
І зразумець
У ранішняй прыгодзе:
Дзень Судны,
Першы і апошні дзень,
Ён будзе доўжыцца
Год ці стагоддзі?

ХТО?

Хто старэйшы, думка ці слова,
Хто шчырэйшы з іх?
Даць адказ,
Можа, зможа чорнагаловы
Змрок спрадвечча, што доўга гас,
Покуль вёў са святлом змаганне.
Смутак слова гукаў,
І гук
Узышоў на нябеснай паляне.
Слова выпала ў Бога з рук.

Думка ўспыхнула невыпадкова
І святлу дадала святла.
Бог спачатку задумаў слова.
Сведкай гэтаму думка была.

ВЕДАЎ

Ведаў Бог,
Які нам свет дарыць,
Каб маглі мы ўсе
Яго нявечыць,
Тужыцца скарыць і разбурыць,
Ці прасцей сказаць –
Ачалавечыць.

Лічым, што за намі
Час бяжыць,
І ад цьмянай радасці
Нямеем.
Ані цямім,
Як на свеце жыць,
А сябе зжываць са свету
Ўмеем…

СМАК

Лепшага смаку няма, чым жыць,
Як імянінніка,
Дзень вітаць,
Сена пражытага варушыць,
Радавацца, што далёка відаць.

Тое, што зблізку,
Бачыць цямней,
Гэтак жа, як недахопы свае,
І на сустрэчу выходзіць раней
З той,
Што на ростань руку падае.

Скеміць,
Што долю ўжо не прыручыць,
Сцяміць,
Што сам непрабудна стары,
І пачынаць ціха рэшту лічыць
І ў капшуку,
І ў календары…

І ТОЛЬКІ СЛЕД НА НЕБЕ

Nur eine Spur im Himmel

Мы знакамі прыпынку ў Вечнай Кнізе,
Нам Усявышні пасылае лёс.
Жывых
Зямля то ўзвысіць, то абнізіць.
Яшчэ ніхто
Свой лёс не перарос.

Мацней людское дрэва каранямі
Трымаецца за ранішні ўспамін.
Зямля сяброў і ворагаў раўняе –
Зямля калыскаю для ўсіх часін.

Каромысел вясёлкі не сагнецца,
Набраўшы поўны вёдры цішыні.
І толькі след на небе застанецца
Ад нас –
Тварцоў зямное мітусні.
Зямля сама сумуе без цяпла.
І толькі след на небе
Скажа смерці,
Дзе наша памяць зорамі ўзышла…

***

Над магілай мамінай гарыць
Вішня,
Быццам восеньская зорка.
Палынам ад успамінаў горка.
Рупіць валунам загаварыць.

ДОМ

Верш напісаць – нібы зрубіць ізруб,
Накрыць страху і намасціць падлогу.
Бярвенне трэба класці руб на руб.
Глядзець павінны вокны на дарогу.

А потым мусіць верш абжыць чытач,
Бо неабжыты дом, як пуня тая,
Якую можа ўпадабаць пугач.
А ў хату Бог, магчыма, завітае…

АДЗІН

Няма да каго прыхінуцца душою,
Нікога наўкол няма,
Душа твая часам здаецца чужою,
Не чуе сябе сама.

Спадаюць дні, быццам з дрэва сучча.
Сплываюць ільдзіны дзён і гадзін.
Адзін прыходзіш на свет калючы
І адыходзіш – адзін.

НЯМА

Няма маіх сяброў, маёй радні,
Маіх вятроў і маразоў
Няма са мною.
Харона не кляну,
Адно зайздрошчу Ною.
Што не аддаў нічога глыбіні.

На схіле веку кожны з нас, як Ной,
Які ў каўчэг сваёй душы
Забраць павінны
І рупна ратаваць
Хоць тыя напаміны,
Што моўчкі пойдуць за глухой труной.

І я цяпер адзін, як напамін
Разгубленай мілосці і сябе самога.
І на каўчэг аціхлы,
Як з далоні Бога,
Ахрыплай каняй падае:
Амін…

А ЯК ЖЫВЕЦЦА…

Алесю Камоцкаму

А багатая душа не скупая
Ні на шчырасць,
Ні на неспакой.
І ніхто ў яе не запытае:
Як жывецца табе самой?

А багатая душа маладая,
Бо старэць ёй няма калі.
А багатая душа галадае,
Не пякуць ёй хлеб на зямлі.

І багатая,
А па-жабрацку
Ходзіць з торбай пустою адна,
Каб было куды зорам сабрацца.
Толькі торба не мае дна…

НА СХІЛЕ

Як мне, малому, хацелася ў свет!
Як мне хацелася вырвацца з хаты!
Я задзіраў галаву, каб хвастаты
Бачыць хоць след
Незнаёмых камет.

Бачыў святло я ды не разумеў,
Што пакідаюць неба каметы,
Не даляцеўшы пэўнае мэты.
Што іх дапальвае,
Ласка ці гнеў?

Хутка і я ўжо гады дапалю,
Не падступіўшыся да небакраю.
І галаву сваю не задзіраю,
Болей хілю,
Каб запомніць зямлю…

АХВЯРЫНКІ

Пусці ў душу Хрыста

*

Пачынаецца дарога з парога.
Якую ні выбірай –
Усе дарогі вядуць да Бога.

*

Хлусня раскашуецца, як гаспадыня
У цёплай хаце ў шумлівых шаўках.
А голая праўда на вуліцы стыне.

*

Нябёсы чуюць тугу калосся.
Сягоння – гэта згаданае ўчора,
Дзе ўсё, што мелася збыцца, збылося.

*

У сэрцы ці ўзімку, ці ўвесну
Богу й маці няцесна.

*

Арол застаецца арлом
І з адным крылом.

*

Кожны ўзводзіць
Сваю Вавілонскую вежу
Ў дакор бязмежжу.

*

Сваю праталіну знойдзе грак.
У ветра кожнага свой вятрак.
*

Ён працінае за ўсё люцей –
Пасівелы боль за дзяцей.

*

Старасць – гэта калі
Чужыя ўсе на зямлі.

*

Жыццё –
Пазычаны ў вечнасці час
Для нас.

*

Слова – ўсяго аснова.
Душа крылатая ў слова.

*

Мама –
Пасрэдніца паміж Богам і сынам –
Дзеліцца небам і хлебам адзіным.

*

Я да скону злучаны з той стараною,
Дзе мама, як зорка,
Стаіць нада мною…

*

Жыць – нялёгкая праца.
А куды падацца?

*

Бог чалавека стварыў,
Каб было,
На кім прыручаць дабро і зло.

*

Хто зможа адказаць на пытанне:
Дзеці – незаслужаная ўзнагарода
Ці заслужанае пакаранне?

*

Пра гэта самае
Каркае на суку варона:
Без грошай і ў спёку сцюдзёна…

*

Думка просіцца ў ісціны на пастой,
Наблукаўшыся
Па сцежках вякоў сіратой.

*

Над мапай шатрую далоні:
Беларусь – лісцінка кляновая,
Якую аб'елі суседскія коні...

*

Твой кожны дзень,
Пражыты й перажыты,
Наперад ведалі легенды й міты.

*

Зямля – аралля і аблога.
Зямля – музей усяго былога.

*

Магчымасць ёсць
Пры любой уладзе
Праявіцца подласці й здрадзе.

*

Трываць мы на зямлі каменны век,
Пакуль на сэрцы
Камень носіць чалавек.

*

А час не затрымаць
Ні днямі, ні вякамі.
Бяжыць, спяшаецца і – не знікае…

*

А ўсё ж цікава:
Ад часу ўцякаем мы
Ці час ад нас уцякае?

*

Ясней па часе робіцца ўсім –
Сяброў у старасці, як валасоў:
Ці дзюжа рэдка ці гола зусім.

*

Толькі ў мамы
Самы суровы дакор
І пяшчотнейшы самы.

*

Звышні дыктоўку гатовую
Ўсім адну і тую дыктуе.
Ды кожны па-свойму яе занатоўвае.

*

Прафесіяй рабіць не трэба злосць.
Прафесій іншых
Шмат на свеце ёсць.

*

Чалавек – пясочны гадзіннік,
Які
Несупынна пераварочваюць вякі.

*

Жыццё – гэта час на зборы ў дарогу,
Каму яго мала,
Каму замнога.

ВЕРА БУЛАНДА

КАБ

Каб лёгка мне было,
Я вас бы не шукала.
І ног не грэла ў коўдры,
Каб цёпла мне было.
І каб было мне светла,
Я сонца б не чакала.
Каб радасць у жытло,
Я б вершаў не пісала.

***

Скарыў сасоннік сон,
Слязой сцякла смала,
Савы страшэнны стогн
Спалохаў стрэл ствала.
Смуга сышла. Сабой
Схавала "ствол" і спеў.
Сноп светлячкоў спакой
Сасны сухой сагрэў.
Сыду сюды, скашу
Страфу сабе, сусвет,
Сама сабе схлушу,
Сабе сатку санет.
Спаду слязой скупой,
Смалою ў сон-сасну,
Славутаю, святой
Сама сябе сасню.

***

Які маленькі дзень,
Імклівыя гады,
І век такі кароткі –
Растане, быццам цень…
І знікне назаўжды
Адзіны міг салодкі.

***

Крывадушнасцю і махлярствам
Перапоўнены нашыя сэрцы,
Быццам лепей нам будзе заўтра,
А яшчэ ляпей – пасля смерці.

ТАНКА

Змярканне ў чарах
Нас запрашала ў казку…
Шкада, канечне,
Што зразумелі позна
Недасягальнасць сонца.

ЗДАЛОСЯ

(лірычная секстына)

Заслухалася голасам тваім,
Загледзелася ў вочы ад нябёсаў,
Пад купалам якіх з табой стаім,
Зноў басанож купаючыся ў росах…
Ад мрояў так забылася зусім,
Што я адна. А што з табой – здалося.

***

О, каб не вуліцы,
Не дом, дзе ты жывеш,
Не тыя сцежкі, па якіх хадзілі,
Не рэчы, што падораны табой –
Я на цябе забылася б даўно.

***

Траўка шаўковая
Да вуснаў хінецца.
Дзе ж той хлапчынка,
Што мне ўсміхнецца?

Шчыра бярозка
Зверху чаруе,
Дзе ж тое сэрца,
Што пашкадуе?

Дзе ж тыя вочы,
Што разумеюуць,
Дзе ж тыя ночы,
Што й сёння грэюць.

ТАНКА

З дабратою мне
Не цёпла, а балесна:
Бо злоснік, рукі
Ля кастра сагрэўшы,
Як вуголле, сэрца затаптаў.

АДКУЛЬ?

Вякамі не спазнаць той яснасці,
Перад якой пытанне ставяць:

Пасля сяброўскае адданасці
Адкуль гарачая нянавісць?

ШЧАСЦЕ

Дайце мне хлеба,
Дайце расінку,
Кавалачак неба,
Рачулкі слязінку.
Песні любімай
Мелодыю дайце…
Толькі б не міма
Уласнага шчасця.

РУБАІ

Калі пасмелі мне зманіць,
Не трэба кленчыць і маліць,
Мяне прасіць аб літасці,
Да шлюбу толькі каб схіліць.

ВАР'ЯТКА

Хай зоркі разгараюцца ў нагах,
Хай сплетніцы нямеюць ад здзіўлення,
Наперакор сабе – ў тваіх руках
Мая журба, мой сорам і сумленне.

Вар'яткай дзікаю мяне лічы,
Лічы за глупства ціхае маленне.
Наперакор табе стамлюся я ўначы
Ля губ тваіх і сэрца на каленях.

Наперакор табе прыйду я ў дождж,
Прымі, як ёсць, дзявочае стварэнне…
Не руш майго вар'яцтва, і ўсё ж
Дай ад яго хоць кропельку збавення.

Дай мне збавенне ад тваіх вачэй,
Ад рук, і ад плячэй, і вуснаў хмелю…
Не ведаю, ці будзе мне лягчэй,
Калі вар'яцтва на дваіх падзелім.

***

Х.А.

Прыадчыняцца дзверы,
Парушыўшы цішыню.
Я – у тваёй кватэры
Без дазволу і без агню.

Прайду ля цябе неўпрыкметкі
І ў крэсле тваім засну.
А ты ля ног маіх кветкі,
І радасць, і ўсю вясну

Раскінеш… Запаліш засню
І залюбуешся мной!
Такою па-хатняму шчаснай,
Звычайнай і незямной.

***

Прачнуцца і з вамі сустрэцца,
З усмешкаю вашых вачэй.
І сэрца ля вашага сэрца,
І плечы – ля вашых плячэй.
І думкі адны, і жаданні,
І мы ва ўсім свеце адны…
Якое цяжкое чаканне
І аднастайныя сны.

***

Не змагу: закрычу і заплачу,
Разганюся – і ў вір галавой,
Каб нічога не чуць і не бачыць,
Каб застацца самою сабой.

Каб забыцца на гвалт і на здзекі
З непрыкаяных сэрца, душы,
Каб пачуць у сабе чалавека,
Да сябе хоць калі паспяшыць.

Так, застацца, забыцца і ўспомніць:
Час рабыню ў вантробах забіць,
Сваёй годнасці вывесці помнік,
Як асобу – сябе палюбіць.

РАЧУЛКА

Рачулка, што нават без назвы ў нас,
Спявала мне казкі і байкі ў свой час.
У люстра яе зазірала лаза:
І добрыя ж вершы ўмела казаць.
Пісала на хвалях іх срэбных яна.
Збірала, здаецца, аж з самага дна.
У новую раніцу новы і верш…
Прыехаць, пабачыць, ці піша цяпер?

***

Аазісы дружбы і дабрыні
Шукаем спакон вякоў.
Чакаем, што зможа абараніць
Нехта ад кулакоў,
Ад злосці, і гвалту, і ад бяды,
Ад страху перад вайной…
На жаль, толькі ў казках жывой вады
Прыносіць заўжды герой.

А МАЯ ГАЛОВАЧКА НЕ БАЛІЦЬ

(песня)

Раніца настоена сырадоем –
У туман абернецца да начы.
Напаю чароўнаю вадою –
Ад мяне ніколі не ўцячы.

Прыпеў:
І няхай пляткаркі языкамі чэшуць,
А мая галовачка не баліць.
Я свайго любімага буду цешыць,
Вусны недаспелыя спяліць.

Адурманю ягадай-дурнап'янам,
Выварожу шчасця берагі.
Любы мой, любы мой, мой каханы,
Самы-самы мілы, дарагі.

Прыпеў.

Праз гады забыліся старыя,
Што такімі ж грэшнымі былі.
І пра іх, як пра нас, гаварылі,
Сплетні разнастайныя плялі.

Прыпеў.

ПРЫЗНАННЕ

Б.С.

Не нарадзіцца мне ў каторы раз,
Не паўтарыцца страснаму імгненню.
Люблю цябе і помню толькі нас.
Ад бед усіх той успамін – збавенне.

І клічу зноў маўкліваю мальбой:
Спяшы ка мне з усіх сваіх еўразій.
Адну б яшчэ такую ноч з табой
Мне перажыць, згараючы ў экстазе.

Адчуць бы зноў бяздоння вышыню,
Далонямі да вуснаў дакрануцца.
Здалёку я цябе не паланю.
Ці зможаш хоць аднойчы адгукнуцца?

Жаданне моцнае збываецца падчас.
Я здольная вярнуць тваё каханне.
Люблю цябе і помню толькі нас.
Ад бед усіх – маё табе прызнанне.

ГЕНАДЗЬ БУРАЎКІН

***

Як вецер лісце шугане
Па скверы,
Ты засумуеш без мяне –
Я веру.

З-за хмар збяжыць змяркання міг
Па промню.
Як добра нам было ўдваіх,
Я помню.

Плыла ад поўні паласа
Скразная.
Ты страхам поўнілася ўся –
Я знаю.

На зоркі клаўся цень крыла
Ціхутка.
Ноч тая цёплая прайшла
Так хутка.

Ёй грэцца ў памяці маёй,
Як цуду.
Да скону дзён маліцца ёй
Я буду.

***

Да рослых алешын шэрых
Сцяжынка вядзе крутая.
Ну вось і знаёмы бераг.
А возера зарастае.

Кагосьці ў густым чароце
Чакае лодка пустая.
Чырок плыве ў адзіноце.
А возера зарастае.

Чарнее кладка старая,
Яшчэ не забытая,
Тая,
Пагодлівы дзень дагарае.
А возера зарастае...

ТЫ ПАЧУЙ МАІХ ВЯСНОВЫХ ЖУРАВОЎ...

(песня)

Як напоўняцца блакітам у лясах густыя цені
І вясна сыпне пралескі з рукавоў,
Пасярод зямлі спыніся –
І ў зялёным шапаценні
Ты пачуй маіх залётных журавоў.

Як над пыльнаю дарогай, над рамонкамі і жытам
Пранясецца цёплы вецер лугавы,
Аб далёкім-незабытым,
Аб нялёгкім-перажытым
Нам з табою пракурлычуць журавы.

Як у горкай адзіноце і табе нялёгка стане,
З сіняй высі і з далёкіх астравоў
На кароткае спатканне,
На самотнае расстанне
Ты пакліч маіх вясновых журавоў.

Ты пачуй маіх вясновых журавоў...

***

Вецер страсае
Нясмела і ціха
Золата першай асенняй красы.
Верасень
Ніжа на павуцінне
Кропелькі ранішняй чыстай расы.

Гронкі цяжкія
Схілілі рабіны.
Клёны
Калышуць крамяную медзь...
Колькі мы ў садзе не дарабілі,
Можна яшчэ да змяркання паспець.

І калі неба
Ласкава і светла
Раптам абмые запылены плот –
Гэта паважнае бабіна лета
Плача пасля пережытых турбот...

***

Гартае восень жоўтыя лісты –
Старую кнігу вечных успамінаў
Пра беззваротны век свой залаты,
Дзе доўгі спіс сакрэтаў і правінаў.

Лагодна ціша селіцца ў душы,
Але, з былым сустрэўшыся, няйначай,
То светла заўсміхаецца ў цішы,
То ачышчальна ўпотайкі заплача.

Прылёг свавольны вецер на мяжы,
Дзе колецца іржэўнік цёплай шчэццю,
Дзе віснуць зоркі выспелых ажын
І павуцінне серабрыста тчэцца.

А цень лясоў ужо хавае стынь.
З лагчын плыве туман сівы і рэдкі.
Сціхае смех.
І ападаюць кветкі...

Гартае восень жоўтыя лісты...

***

Снег пад нагамі хрупае,
Дол засцілае чорны.
Сыплюцца белыя крупы
У ветра вірлівыя жорны.

Мяккаю пытляванкай
Усё наваколле запудрана.
Нібы млынар,
Ля ганка
Дуб азіраецца мудра...

***

Гэта тайна
Спрадвечнай
На свеце была:
Паміж зоркай і свечкай
Ёсць нітка святла.

У начы безгалосай
Шлях падкажуць і мне
Зорка ў цёмных нябёсах,
Свечка ў дальнім акне.

Сумна ў сэрцы асядзе,
Як і ў даўніх вяках, –
Зорка ў мілым паглядзе,
Свечка ў мёртвых руках.

Дажывуся і сам я
Да самотнай пары,
Калі зорка згасае,
А свечка гарыць.

Кожнай кропляй гарачай
Лье святло, як спакон...
І не мне перайначваць
Гэты вечны закон.

МАЛІТВА

Мы здалёку ўбачылі свабоду
І яшчэ не вырваліся з пут...
Божа,
Не дабаў майму народу
Пошасці,
Няпраўды
І пакут.

У чужым нялюдскім землятрусе
Хіба ў нечым мелі мы віну?..
Божа,
Адвядзі ад Беларусі
Здраду,
Вераломства
І вайну.

Смутнаю парою нелюдзімай,
Калі ўсё наўкол ідзе на злом,
Божа,
Захіні маю Радзіму
Мудрасцю,
Спакоем
І цяплом!

ВАСІЛЬ ВІТКА

У ІМЯ АЙЦА...

У імя Айца і Сына
І ўсемагутнага Духу,
Божа, не грукай у спіну
І не лупі па вуху.

Ты так мяне, грэшнага, перыў,
Што я ўжо ва ўсім вінюся,
Самаахвярна веру
Кожнай тваёй аплявусе.

Нібыта на прывязі чоўнік,
Снуюся ў жыццёвых кроснах,
Раб твой, слуга твой, чыноўнік,
Якому ад страху млосна.

Ледзь тузанеш нагавіцы,
Урэжаш казённай папругі,
Прысыплеш азадак гарчыцай,
А потым прызнаеш заслугі.

Падымеш мяне, балеснага,
Спагадай прылашчыш урэшце,
І я ўжо спяваю песні
Пра дзіўнае дзіва ў рэшаце.

Аж выпінаюся з сілы,
Першы бягу за пратэсай
Навысціжкі перад усімі,
Паперад самога прагрэсу.

Таўку ўжо іншых у спіну,
З размаху луплю па вуху

У імя Айца і Сына
І ўсемагутнага Духу.

ПАКАЯННЕ ПРАМЕТЭЯ, ЯКІ ЎКРАЎ БЛАКІТНЫ АГОНЬ

Божа,
Навошта мне быў
Твой агонь?
Толькі для пробы ты
Знарок рашыў асілка свайго
Зрабіць
Рабом
Робата?

Калі тварыў ты свайго Адама,
Яшчэ не маючы практыкі,
Тады не было ў цябе ні праграмы, ні плана,
Ні чарцяжоў Галактыкі.

Не дзіва, што ўпарты Адам
Разам з цікаўнай кабетай
Да ўсяго заўсёды даходзіў сам,
Раскрываючы тайны сусвету.

І хоць набіваў гузакі на ілбе,
Вобмацкам ідучы па зямлі,
Як ён радаваўся, калі
Адкрываў сам сябе!

Цяпер у нас жалезныя нервы,
Не прыстаюць да ілбоў гузакі.
Нашы Евы грызуць не яблыкі, а кансервы,
Кансервы кахання,
Паэзіі,
Музыкі.

Хутка пачнём праз экран цалавацца,
Прыладзіўшы губы хобатам,
І будуць у нас нараджацца
Шчаслівыя робаты.

А я, прыкаваны
Да тэлеэкрана,
Ужо не асілак, а цень яго, –
Прашу, Усявышні, табой пакараны:
Даруй мне,
Што ўкраў
Блакітны
Агонь.

СТАРАВЕР

Не пішу
Верлібрам,
Грашу
Старым калібрам.

Ніколі разабрацца
Не мог я ў новай модзе,
Шчыруючы на градцы
На ўласным агародзе.

Сярод жывых не першы,
Не лепшы між памершых,
На рыфмах зубы з'еўшы,
Пісаў свае я вершы

Для дома,
Для альбома
І трохі
Для эпохі.

КАЗКІ І КРАСКІ

З чаго пачынаецца сонечны дзень?
Вядома, што з новае казкі.
Зірніце, ледзь дакрануўся прамень
Лясной серабрыстае краскі –

Зазіхацелі кроплі агню,
Апошнія пацеркі ночы,
І праз настылую цішыню
Выбіўся кволы званочак.

Ашчадна жамчужную іскарку дня
Ландыш нясе ў далонях.
Спіць яшчэ ўся палявая радня,
Накрыўшыся коўдрай зялёнай.

Першы прачнуўся Дзядоўнік стары,
Але не ўстаюць без прынукі
Дзеці, што любяць паспаць на зары,
І асабліва – унукі.

Цяжка, вядома, што ні кажы,
Бачыць старому без жалю,
Як тоненькі Дрыжнік спрасонку дрыжыць,
Як туліцца Піжма ў піжаму.

Прачнуўся касматы, нячэсаны Сон,
Вылез з начное кашулі.
Сее зязюля на купіне Лён,
Гусі саджаюць Цыбулю.

У кожнага клопат пра свой агарод,
Кожны свае даглядае расліны:
Казёл з казою – Казлабарод,
Свіння – Свінакроп, журавель –
Журавіны.

Век не было гультаёў у бары,
Ахвотнікаў на дармоўку.
На расцяробах самі зубры
Сеюць сваю Зуброўку.

Дружна ўзяліся расці Львіны зеў,
Конскае шчаўе, Каціная мята,
А Кураслеп адцвісці паспеў –
Будзе ўраджай багаты.

Будуць ад працы і плён, і спор,
Калі гаспадар харошы.
Не налюбуюцца мышы з нор
На сіні Мышыны гарошак.

Кветкі людскія імёны бяруць,
Ёсць васількі, Маргарыткі.
Наша здароўе яны берагуць,
Нашы шануюць здабыткі.

Прастудзішся –зварыць папрасі
Маліны, Дзіванны, Руты,
Усім прыбаўляе сіл Дзівасіл,
А Валяр'ян у нас доктар славуты…

Вірыць над Сланечнікам радасны рой,
Смокчуць салодкае сонейка пчолы,
І чмель з неразлучнай чырвонай трубой
Вандруе ў паход свой вясёлы.

Адзін авадзень ашалела гудзе
І вывіжоўвае вокам –
Якую хутчэй яму высачыць дзе
Ахвяру непадалёку.

У казках ігрушы растуць на вярбе,
Грамаце вучыць варона сароку.

Гавораць, знайшоўся адзін верабей,
Што возера выпіў у спёку.

Ад спёкі ў гаі дзяды-салаўі
Ратуюцца Іван-чаем.
Норма ў іх – самавар на дваіх,
Асушаць, другі закіпае.

Тым часам зямлю ўжо ахутвае змрок,
Клубіцца туман на балотах,
Пара маладым салаўям на урок –
Новыя песні развучваць па нотах.

Весела дзённая казка ідзе,
Бае, што бачыць і чуе,
І за сабою сябровак вядзе –
Вячэрнюю і начную.

Гэтак за днём і мінаецца дзень,
Ночкай змяняецца ночка.
Строга трымаецца ранні прамень
Малога свайго званочка.

Толькі кранецца раніцай ён
Лясной чарадзейнай краскі –
Звоніць сярэбраны тэлефон:
Слухайце, слухайце казкі!

ЛЕЎ

– Што сталася з Пятром Пятровічам?
Учора я яго сустрэў.
Такім ён голасам не роў яшчэ.
Не чалавек – сапраўдны леў.

Так смела ён крытыкаваў начальніка.
А быў жа, помніцца, ніжэй травы.

Усё жыццё хадзіў маўчальнікам,
Падняць баяўся галавы.

– Ах, дружа мой, –
Старыя песні:
І заяц львом
Становіцца на пенсіі.

ЭПІТАФІЯ

Каб устаць і дазнацца я мог,
Хто пісаў на мяне некралог,
Ліў няўцешныя, горкія слёзы
Над маёю паэзіяй, прозай, –

Я гатоў бы спачатку пачаць,
Каб спаўна ўсім даўгі вам аддаць.

СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ

ЧАЙКІ

Аб заінелыя закрайкі
Прыбой разбіўся і аглух,
І растрывожаныя чайкі
Губляюць пасівелы пух.

Закутае марозам мора
Знямее, штормы замаўчаць,
А чайкі будуць склёўваць зоры
На слізкім лёдзе па начах,

І, трацячы ў знямозе сілы,
На зломе смерці і жыцця
Аб крыгі пазбіваюць крылы,
Але на бераг прыляцяць.

РАДНЯ

5 жніўня 1824 года па дарозе з Адэсы ў Міхайлаўскае ссыльны Пушкін спыніўся ў Магілёве. Тут з радасцю яго сустрэлі прыхільнікі.

Ад раніцы і да змяркання
Паміж лясоў, балот, пяскоў
З выгнання едзе у выгнанне
Паэт дарогаю на Пскоў.

На Беларусі спее лета.
Жывіцай дыхае з бароў,

І тут, здаецца, у паэта
Няма ні блізкіх, ні сяброў.

Ён ловіць кожны гук і слова
Жывой славянскай чысціні,
І замільгалі Магілёва
У змроку першыя агні.

Плывуць з Дняпра за хмарай хмары,
Гамоніць пастаялы двор,
І раптам статныя гусары
Яго здзівілі звонам шпор.

Пазналі, узнялі на рукі –
Не адкруціцца, не ўцячы.
І не змаўкаюць песень гукі
Да самай раніцы з начы.

Кіпяць і пеняцца бакалы,
Маланка б'е на ўсе бакі,
Грымяць вышэйшага напалу
Вольналюбівыя радкі.

І Оду "Вольнасць" з хваляваннем
Чытаюць новыя сябры,
Пакуль малінавае ранне
Не занялося на Дняпры.

Пара выгнанніку ў дарогу:
Чакаюць коні і вазак,
Але гусары ля парога
Не развітаюцца ніяк.

Яго праводзяць да заставы
І пазіраюць доўга ўслед,
Здаецца шлях дарогай славы
І грозным волатам паэт.

А ён гайдаецца ў карэце
Пад песню жней насустрач дню
І знае, што на белым свеце
Ён мае блізкую радню.

ДАВЕР

Празрыстая аж да прадоння
Мая палеская рака,
І я на беразе з далоні
Кармлю падбітага шпака.

Ён пазірае з недаверам
Трывожным вокам з-пад павек.
Няўжо яму каварным зверам
Здаецца кожны чалавек?

І брыдка робіцца, і горка,
Калі, убачыўшы мяне,
Як апантаная, вавёрка
На елку з хвоі сігане.

І нават спуджаныя коні
Бягуць у засень хмызняка.
А я шчаслівы, што з далоні
Кармлю маленькага шпака.

АСЕННІ ДЗЕНЬ

Дзень па-асенняму кароткі.
Зганяе вецер з хваль луску,
І перавернутыя лодкі
Гудуць на стоптаным пяску.

Празрыста, пуста і сцюдзёна.
Бярэзнік, як манетны двор,

Чаканіць золата штодзённа
І шчодра кідае ў касцёр,

Што задыміўся верасамі,
Што тлее жарам журавін
І над празрыстымі лясамі
Шугае полымем рабін.

Ляцяць лісты з няўлоўным рэхам
На бераг, сцежкі і сляды,
А мне здаецца, пахнуць снегам
Мае наступныя гады.

ВАСІЛЬ ЖУКОВІЧ

ЛЕТНІ ВЕЧАР

Спёка адпачыць пайшла ў даліну,
Лёгкая раса траву халодзіць,
Над зямлёю сонца колеру маліны,
Шарам дзьмухаўцовым поўня узыходзіць.

***

Сэрца я сваё транжыру
з легкадумнасцю юначай,
хоць і радзілі мне шчыра
навучыцца жыць іначай.

Без эмоцый, асцярожна
жыць, каб лепей захавацца,
навучыцца, мабыць, можна.

Не хачу жыцця баяцца!

ПАЭЗІЯ

Ты не заўсёды – быль,
і не заўсёды – боль,
ты не заўсёды – доля;
ты часам – мікрасвет,
але заўсёды – воля,
хоць і зняволены паэт.

***

Згарэў у тлуме дзень высокі.
Дом, сад – ахопленыя сном.
Але што гэта? Крокі?
Крокі
чые
расталі за акном?

У цішыні было здалося:
час прыпыніўся...
Ды плады
раняе сад,
ідзе ўжо восень.
Ці бачылі яе сляды?

ПРЫ СВЕЧКАХ

І гараць, і згараюць,
нібы нашыя дні,
дзве танюткія свечкі
у жывой цішыні.

І гараць, і згараюць
пад вятрыскі выццё
дзве ахвярныя свечкі,
як і наша жыццё.

І адвадзіць напасці,
цемру гоніць і зло,
і прарочыць нам шчасце
тонкіх свечак святло.

Хай забудзецца горыч,
будзем волю ствараць.
Свечак полымцы поруч
гэтак шчыра гараць!

Скажам не – паняверцы,
звадзе, здрадзе, мане.
Так нагадваюць сэрцы
свечак полымцы мне.

***

Мог заручыцца я рабром,
што ў зло ніколі не абернецца
табой пасланае дабро,
а што яно дабром і вернецца.

Быў расчароўваўся не раз.
Ды мне, адкрытаму, зноў верыцца:
не, на тваё дабро ў адказ
усё ж такі не ліха вернецца.

АКТАВА

Як часта мы губляемся дарэмна
і раўнавагу страчваем ураз:
на роўным месцы так бывае дрэнна
і дробязі бянтэжаць дужа нас.
Тады нам ганіць бліжняга прыемна
ці скардзіцца на бліжні свет, на час,
І толькі не стае, на жаль, развагі
ды, каб свае грахі прызнаць, – адвагі.

НАРАЧ

Сонцам зацалаванае,
аблашчанае вятрамі,
апетае, аблюбаванае
салоўкамі, жаўрукамі
ты, возера Нарач.

Чайкі над хвалямі,
на беразе сосны..
Валодаеш чарамі
ў краі дзівосным
ты, возера Нарач.

Красу адлюстроўваеш
нябёсаў глыбокіх,
душу ты настройваеш
на лад на высокі,
о, возера Нарач!

***

Я збудую палац табе,
самы светлы, прасторны,
непаўторны, як шчырая песня,
я збудую палац, у падобным якому
не жыла не адна каралева.

гэта будзе палац нябачны,
з незвычайнага матэрыялу.
Каб узвысіць яго, не патрэбны ні мармур,
ні золата, ні малахіт.

Я збудую палац з невычэрпнае ласкі,
упрыгожу цудоўным настроем.
узніму я палац,
калі толькі
мне не здрадзіць каханне тваё.

ЗАХАД СОНЦА І АДЗІНОКАЯ КРАСКА

Краска,
што вырасла на беразе мора,
развітвалася

на цэлую ноч
з яго вялікасцю СОНЦАМ,
якое на захад ішло.

Яна ледзь прыкметна
ківала яму, вялікаму,
маленькай сваёй галоўкай,
ледзь-ледзь варушыла далонькамі
сваіх нешматлікіх лісткоў.

Яна доўга бачыла
развітальныя промні СОНЦА,
бо мора было спакойнае,
роўнае, як палатно мастака.

Краска
была верная СОНЦУ
настолькі,
што з яго заходам
згарнула-схавала
ўсё сваё харство.

***

Навошта
вам замах
на недатыкальнае;
як можна дадумацца да таго,
каб заарканьваць мае думкі?
Чаму вам трэба, іх, крылатых,
збіваць на гарызантальны ход?
Вар'яты!
Поўзаючы, рухаюцца вусені, змеі,
дый яны любяць волю.
Лёгка задаць накірунак робатам,
самаходам..
Але ж д у м к і – арлы, сокалы,
нават анёлы!

Праляцеўшы аднойчы, яны поўзаць не будуць –
думкі л ё т а м сваім
застаюцца ў Прасторы і Часе.
Некрылатая думка, неглыбокая думка?..
Бывае.
Ды яна не знікае бясследна.
А крылатая, нарадзіўшыся, нараджае сама:
так, энергія лёту, святла і цяпла
нараджае іншыя думкі, выклікае пачуцці.
Была – адбылася,
яе не стрымаць,
не замкнуць,
не скаваць!
Ах вы, думкі мае,
думкі-арлы,
думкі-сокалы!

КРЭДА

Колькі жыць буду я,
хай жыве пачуццё найсвятое,
а яно ў мяне ў сіле й красе:
я шкадую ўсім сэрцам людзей
ужо толькі за тое,
што смяротныя ўсе.

ЗЬНІЧ

РЭХА МАЛІТВЫ

***

Па-за зямнымі багацьцямі,
за ўзнагародай і карай
шэпчуцца рыфмы з паняцьцямі
там, дзе адвольныя мары….

***

Вякі плывуць
А Ён – раскрыжаваны,
Жывы…
Ў крыві цячэ цвікоў іржа…
І род людскі,
Лянівы,
Апантаны,
Ня мае сілы
Зьняць Яго
З крыжа…

***

…Боскасьць –
вечны цяжар і пакута…
Ўсё да рэшты – самота…
Нябыт…
Ў зорным россыпе бэзавы смутак…
Стогн сумленьня
І думкі блакіт….

***

З россыпу слоў-крышталю
Прэлюдыяй і высновай
Промнем Хрыстовай хвалі
Блісьне
Боскае
Слова…

***

За што ты церпіш неадольны зьдзек
Адчужанай абрыдлай працы?
Куды плывеш ты, Божы чалавек,
Прыкуты да галер цывілізацыі?

Мне рэхам
Першародны грэх….

ФІЛОСАФУ

Ты да ваўка падобны –
Урэшце, калі разабрацца,
Воўк – санітар прыроды,
Ты – санітар грамадства.
Церпіш лютае глупства
Людское катавальні…
Зьведаў бы сьвет:
Самагубства
Нішчыць ваўкоў татальна….

РЭХА АСЬВЕТНІЦТВА

Па-новаму кесары мусяць паліць
Адвольную думку і мару…
І роспачнай, чорнай малітвай гарыць

Вальтэр: “Раздушыце пачвару!”

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Выпрывай,
Мова,
Праз –
Зьнічаваньне…
Духу выснова –
Раскрыжаваньне.

ІНА КАЛЯДА

ЧЫРВОНАЯ КНІГА

У людзей сабачыя вочы,
У людзей вільготныя рукі,
У людзей пяшчотныя вусны
І дзіцячыя пальцы ног.

У людзей крохкае сэрца –
Башмакі на яго не стаўце.
У людзей ламаюцца пальцы
Аб сэрцы іншых людзей.

У людзей губляюцца думкі,
У людзей сціраюцца вершы,
У людзей канчаюцца ручкі,
Ледзянеюць у зрэнках шыльды.

Для людзей няма месца ў маршрутках,
У людзей бездакорнае горла,
У людзей выпускаюць птушак,
У людзей гадзіннік не йдзе.

У людзей усё менш спадзяванняў,
У людзей патухаюць пагляды,
Ад людзей патыхае смагай,
Завіваюцца валасы.

***

Усё чакаю – неба выразаю
Выцінанкай на лядзяным шкле,
Вершавана кучары збіраю
Маляўнічым шнарам на чале.

Усё чакаю – веру ў нарачонасць
На пуантах па вуглях хадзіць.

Каб у электрычнасці спагады
Напалохаць талентам імгненна,
Знікнуць, каб забылі, каб фанабэрна
Маё не асуджалі нараджэнне.

***

Быць жанчынай – строгі абавязак:
Цёплай і даверлівай, прыгожай,
Цвёрдай, і рэальнай, і змагацца,
і баяцца: не тэлефануе,
ды выцягваць душы з пекла сілай,
І заснуць, і пахнуць малаком,
і ўмець прачнуцца зноўку разам,
і ўбачыць погляд блізка
хоць аднойчы.

***

Спі, каханы,
Я буду плакаць
Непражытымі ролямі,
Няўяўнымі жыццямі,
Немагчымымі шчасцямі,
Напаўзаючым холадам.

Ты далёка,
Я буду плакаць
Незавітымі косамі,
Несапраўднаю існасцю,
Пражытымі снамі.

Спі, каханы,
Хай сон твой не збудзецца!

***

Сонца грукат
Абцасамі ў зрэнкі.
Вокам сінім
Наўпрост у неба.
Фарбаў хочацца,
Схаладнелася будучым.
Як дарога цячэ
У вочы
І знікае бесперспектыўна.
Неба хочацца,
Як галоднаму.
Сонца спеваў
Чакаць увосень.
Ярка хочацца.
Рэзка хочацца.
Быць хочацца.

УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

ДЗЯЎЧЫНА ПАД ДАЖДЖОМ

Над лесам, над садам дзікім
Дожджык забалбатаў,
І ўспыхнулі раптам гваздзікі
У нетрах абмытых траў.
Цёплыя кроплі скачуць
Па залацістай лазе;
Дожджык – "царэўна плача",
Сонца ў кожнай слязе.
З нізкай цёплай адрыны,
Учуўшы ласкавы капёж,
У лёгкай сукенцы дзяўчына
Выбегла проста пад дождж.
Кроплі яе цалавалі
Палка, пяшчотна, да слёз,
Вусны дзяўчыны хапалі
Срэбра з ясных нябёс.
Дожджык зрабіў сваё цуда,
Ён абляпіў, як мог,
Плечы, маленькія грудзі,
Гнуткія лініі ног.
Бэзам з садоў павявала,
Вечна хацелася жыць.
Дзяўчына ад шчасця спявала.

Стронцый быў у дажджы.

КАЛІ ПАМІРАЮЦЬ...

Калі паміраюць дрэвы – яны павольна падаюць
на зямлю,
Больш павольна, чым пушок адуванчыка, –
і застаюцца ляжаць.
Калі паміраюць жывёлы – яны засынаюць у ветрабоі
Або чарнеюць на раллі уздзьмутым жыватом,
А над ім драпежна цягнуцца павольныя аблокі.
Калі паміраюць гарады –
па анфіладах крочаць рыжыя львы
І слізгоча струменьчыкам ртуці змяя па карцінах,
што ўпалі ў музеі.
Калі паміраюць планеты – застаюцца свінцовыя воды
І свісцячая песня пяскоў у расколінах скал.
Калі памірае каханне... Але каханне не памірае.
Яно вечна застаецца ў грудзях лікуючай тугою слоў,
Безнадзейным болем і непатольнай пяшчотай,
Калі нічым не дапаможаш, хаця сэрца аб зоры разбі.
Плач дрыядай, рагачы сатанінскай няшчыраю
ўсмешкай,
Львом куртатым кроч, слізгай самаахвярным змеем
Або падлай няшчаснай валяйся на ворыве лёсу –
Ўсё дарэмна. Няма дапамогі. І смерці няма ў кахання.
Чалавек толькі смертны. Але калі дрэвы не помняць,
Гарады не помняць, не помняць нямыя планеты –
Сэрца помніць каханне і попелам стаўшы з агню.
Аб пушыстым снезе бясконца яно ўспамінае,
Аб слядах на снезе, аб любых заснежаных веях,
Аб журботнай усмешцы і аб горкіх, апошніх,
бязважкіх
Пацалунках у вочы, запясці і вуснаў ражкі...
Скрухай поўнае, ўспамінае мёртвае сэрца
І аб тым, чаго не было і не будзе болей ніколі:
Аб агні ачага, аб неадчэпных цёплых дзіцячых далонях,
Аб жаданні пакласці жыццё за яе і з успоратым горлам
Прыпаўзці і падохнуць ля ног, уратаваных табой.
Не забываючы здохнуць. Усё помніць і мёртвае сэрца

І кружляе з крыкам перадсмяротнай і ўсё ж
бессмяротнай тугі
Над магіламі мёртвых Багоў,
Над журботным спакоем зрынутых дрэў.
Над жывёламі, кінутымі на раллі,
Над планетамі мёртвымі і гарадамі –
Бессмяротнаю каняй, што помніць аб кроплі вады.

***

О вясна! Таполі! Свеце мілы!
Сонца німб! Аблокі! Сад! Рака!
Залатая падаплёка крылаў
Маладога звонкага шпака!
Вечар зацяпліў бярозак свечы.
Я адзін. Ты не памёрла, не.
Мой забыты, мой апошні светач,
Ты ў чужым акне, а не ў труне.
Як магла застацца ты ў кайданах?
Як магла адмовіцца пайсці
Да палян, дзе месяц закаханы
Песні "сноў" блакітныя ўзрасціў?
Пэўна, я турму не здолеў тую
Гнеўнаю пагардай скалануць,
Дзе цябе цалуюць, як катуюць,
І ўладарна лашчаць, быццам б'юць.
Вей тваіх, плячэй тваіх пахілых
Болей не кране мая рука…
Над сусветам залатыя крылы
Маладога звонкага шпака.
Клічуць лебедзі ў начы вясенняй,
Кідаючы поўдзень салаўям,
І разліў шырокі, як натхненне,
Як любоў забытая мая.
І няма ў душы маёй праклёнаў,
І няма на веях цяжкіх слёз…
Заставайся ў клетцы залачонай –

Ты сама абрала гэты лёс.
Над кахання нашага магілай,
Што загубіцца ў былых вяках,
Залатая падаплёка крылаў
Маладога звонкага шпака.

ШЧАСЦЕ

Не хачу старым упівацца,
Не жадаю гібець у сне.
Сёння выпаў, як кветкі акацыі,
Сакавіцкі апошні снег.

Ён крычыць пад нагамі ад шчасця,
Ён спявае аб новых днях,
І драты, як марскія снасці,
Знову здатныя ветразі ўзняць.
Ноч ідзе са мною да рання,
Каб сустрэць пацалункам яго –
Новы дзень мой, маё світанне,
Новы прывід шчасця майго.

БЕЗГАЛОВАЯ ВЕНЕРА

Стаю ля яе ў задуменні
І голас пяшчотны чую;
"Прыйдзіце, мужчыны, ад зброі, –
Ўлонне маё сумуе.
Прыйдзіце, мужчыны, ад сечаў,
Ад турмаў, ад страт на світанні.
Адзінае ёсць на свеце:
Сумленне, братэрства, каханне".
І думаю я неадчэпна:
За што ж ты бяду спаткала?
За што галаву ты згубіла?
Якую праўду сказала?

ВАЛЯНЦІНА КОЎТУН

ЦЫГАНСКАЯ ЭКСПРЭСІЯ

Сыны вятроў.
Унукі першай зоркі...
Ваш след астыў на бацькавай зямлі.
Скажыце, як
у шляхах салодка-горкіх
вы песні продкаў мужна зберагліі?

Гараць кастры, пра даўняе гавораць.
З размаху б'юць старыя капыты.
Як многа песень высушыла гора.
Як мала песень выйшла з нематы!

О зорны бог!
Няўрымслівы і ўпарты.
Ты зведаў шчасце,
Выцерпеў падман.
Падняўшы джала з чэрапа пагарды,
Змяя выгнання
страшыла цыган.
Не гнеў, а боль...
Не гром, а сум знямогі...
Гітарны спеў зацёрты да крыві.
А ў рукавах – бясконцыя дарогі,
І толькі плечы пыл сівы абвіў.

Стары цыган з трывогай-таямніцай
Цугляе сны дзіцячыя здавён.
Хай крыкне птушка,
Дрогне кабыліца
І паімчыцца спуджана ў палон.

Ляцяць насустрач высмяглыя травы,
нясуцца кручы, коцяцца агні.
Ёсць толькі лёс...
Няма падманнай славы.
Ёсць толькі песня. Роспачы – ані!

Спявай, цыган, у месячным абозе.
На струнах пальцы чуйныя крыжуй..
Ты не пакінь, зямля, яго ў трывозе.
Ты падай, зорка,
ў светлую душу.

***

Хоць прымарожвае як след,
Хоць іней колкі дол ашпарыў
І месяца блішчасты след
Ускочыў у густую хмару,
Ігліцы ападае звон...
Сцяжыну карані ўзрываюць.
Зялёныя дымы сасён
Птушынку дробную гайдаюць.

***

Перад табой забытую дарогу
Я разгарну. Нібы абрус яна.
Хай сцелецца ад роднага парога
Да хаты, дзе радня і дабрыня.

Няхай ідзе праз гулкія дасвецці,
Люляецца ў палях і гарадах.
Няхай з душы жывое слова вецер
Не выкіне, як птушаня з гнязда.

***

Перамелецца, перагарэніцца,
Пераб'ецца як-небудзь нічым...
Пацалункаў апошніх мяцеліца...
Нам гарача –
мы ў санках ляцім.

прагных позіркаў першая цнота.
Адзінота мая,
адзінота!

***

Як востры амцыёлы,
Расцёкшыся па сцежцы той,
Мяне ўдарыў двор вясёлы
Любоўю, смехам, глухатой.

Ён абгароджаны высока
Жыццём і ценямі з магіл.
І ранні дым, як шэры сокал,
Так нізка водзіць мне кругі.

Там клямка бразне, сцежка дрогне,
там лісцем стоеным гару.
Тваю гардыню ўсю ў кароне
Цягну к сабе, як бор хмару.

Мы радуемся, ходзім рана.
Ў бары зязюленькі «ку-ку».
Пяць пальцаў, нібы пяць маланак,
З плячэй, прашу я, – скінь руку.

***

Гэтак забываю вас,
Нібы клін у шчасце забіваю,

Нібы зноў цвіце на ранах час...
Трэба жыць... І я цяпер жывая.

Трэба жыць і роднай, і чужой,
Маладой і роспачна забытай,
Каб вятры паходжвалі за мной
Каралеўскай ядавітай світай.

Каб капалі дол плугі мае –
Не магільны, а жытнёвы ў маі...
Дождж пайшоў. І так бясконца б'е,
Нібы клін у сэрца забівае.

ВЯЧЭРНЯЕ

Гараць, гараць вуголлем мазалі.
Парогі дзён.
Аж змучыла дарога.
У раўнадушша ўсе парады:
«плі!»
І спачуванне, як для некралога.
Усё часцей на іх гляджу вачмі
Каханага,
сяброўкі,
нумізмата.
Акроплены крывёю акрабата,
О чорна-белы свет мой, адпачні...

прыглушвай сэрца, вечны свой
пароль,
Вядомы толькі гібелі і ўлонню.
Жыву страсцямі продкавых асоль
І ўсіх памылак
проста ўжо
не помню.

***

Яшчэ зусім не развітанне.
Над борам горда сонца ўстане.
Ды тонкім пахам чабару
З лясной магілы той паўстане,
З кім я маўкліва гавару.

Я з ім маўчу пра ўсю будзённасць,
Пра здрады,
пошасці,
няроднасць...
Пра восень з залатым крылом,
Пра вёснаў вечны крыгалом.

Я так маўчу...
пра дзень апошні.
Пра полымя жыццёвай пожні,
Пра хіжасць,
вусцішнасць,
дакор...
Пра бор мой, дзе сляза варожыць
І пахне, як зямля, чабор.

***

Які бясконцы ён, той першы боль...
Калі пачаўся?.. Дзе?.. Здаецца мне:
Маленькая, ляжу каля грудзей
У маладой задумлівай матулі... І раптам –
Выслізнула з рук яе.. І з крыкам
Ляцела доўга ў прорву дзён-начэй,
Па скрыжаваннях сталасці, замужжа,
Турбот, дзяцей, сяброў і дактароў...
І рапатам міг – і той удар аб камень,
Што ўжо ляжаў над матчынай магілкай...

***

Усё прадбачу – дні і ночы...
Усім прабачу –смех і грэх...
І добры спеў, і злыя вочы,
І гром вясны з дажджыстых стрэх...
І – цішыню, бы ў Бога ў вусе,
каб зноў праменнем у траве
Шапнуць на вушка Беларусі:
–Твая дачка яшчэ – жыве!

АМАЛЬ БЕЛЫ ВЕРШ

Гэта толькі здалося,
Што я гляджу ў твае вочы...
Я – іду па дарозе ў няўмелую восень...
Шлях няблізкі. Заліты...
зіхатлівай лістотай.
Ціха шэпчуцца дрэўцы... Ці мо сэрцы,
што гамоняць у космасе ўпотай?

..Птушкі спуджанай – крык.
...Расцінаецца жах нематы.
Нечакана...
Нібы з зарападу,
нібы з перажытага...
Нібы падарунак –
маленнямі –
ты!
гэта толькі здалося,
Што гляджу ў твае зорныя вочы.
Я спяшаюся зноў
У адчай безнадзеі і роспачы.
...Як аслепшы,
Вязе ў непазбыўнае восень
...мяне.

А дарога заліта блішчастай лістотай.
Толькі шэпчуцца дрэўцы
На мове параненых сэрцаў.
...Ці аб здрадзе змаўляюцца ўпотай
у прадчуванні майго
паспешлівага адыходу?

...І ўсё ж...
Гэта толькі здалося,
што вязе мяне восень
з болю пякельнага ўпрочкі...
Што –
гляджу ў лагодныя вочы,
Завеяныя залатою лістотай.
Ну вядома... Гэта толькі,
як колісь, здалося...
Дзесь ліхтар засвяціў адзінокі.
Лісце падае...
ў крокі
той палатнай сівой пекнаты,
Дзе ўжо вывелі ўзор мне
павучыны глухой нематы,
Дзе штодзённа з «ніколі»
Аб'яўляецца ў сэрцы
Прысутнасць...
Гэта толькі здалося, што вязе мяне
З жарам калінавым восень.
Падымаюся.
Іду сама...
Спяшаюся,
Збіваючы локці аб нечаканыя вуглы,
Грукаю
скрываўленымі кулакамі
ў дзверы абрыдлай хлусні.
Малюся:
– Анёле мой! –
Хоць адну сустрэчу!

Аднаго, самага-самага...
Чалавека...
Падаруй... Анёле мой!
Злітуйся.
Хоць нпарыканцы жыцця...

Гэта толькі здалося,
Што гляджу
у збалелыя вечнасці вочы,
Выціраючы воцатам вусны
няспраўджанага кахання.

Гэта толькі здалося,
Што коней на сцежцы жыцця
Зноў цугляе жарсцей маёй
восень...
Гэта толькі здалося.
Гэта толькі здало...
З цішыні... З глыбіні...
З нематы...
Нечакана.. Раптоўна,
як з выбуху роспачы...
Як з прытвору нямоленага, –
Ты,
Госпадзі!

ВАЛЕРЫЯ КУСТАВА

***

Жанчына, цяжарная сынам, –
Жанчына, цяжарная Богам.
Не
чапайце
Жанчыну,
якая носіць малога!
Чэрава маці – заслона,
ахова дзіцяці святога.
Айчына, цяжарная сынам, –
Айчына, цяжарная родам.
Не
чапайце
Айчыну,
Якая носіць народы!
Зямліца, цяжарная сынам, –
Зямліца, цяжарная воем.
Не
чапайце
Зямліцу,
Якая выношвае волю!
Сцябліна, цяжарная сынам, –
Сцябліна, цяжарная плёнам.
Не
чапайце
Сцябліну,
Якая носіць імёны!
Ралліна, цяжарная сынам, –
Ралліна, цяжарная лёнам.
Не
чапайце
Ралліну,

Што носіць урод зялёны!
Сцяжына, цяжарная сынам, –
Сцяжына для пакаленняў.
Не
  чапайце
        Сцяжыну,
Якая носіць каменне!

***

Я магу
        чакаць без сканчэння,
покуль знікнуць
        словы і ноты.
Абмяжоўвае
        летазлічэнне
маладосць
        маёй адзіноты.

***

Здранцвеюць вусны –
буду вачыма
гаварыць.
Выкажу вочы –
буду рукамі
глядзець.
Прагледжу рукі –
буду сэрцам
вітацца.
Развітаю сэрца –
буду душою
біцца.
Разаб'ю душу –
буду…
Буду.

***

Са стагоддзя ў стагоддзе
змяняюць правілы,
з года ў год
паляпшаюць законы,
з дня ў дзень
усталёўваюць парадкі –
З часоў Стварэння Свету
заганяюць прастору ў рамкі.
Калі Я – мяжа,
Я – ваша
памылка.
Выпраўце правапіс!

***

Ці быў ты немаўлём?
Дзе тваё маленства?

Буду, буду!
Яно прыйдзе, прыйдзе!

Не веру сваім абяцанням –
Нарадзіўся хрышчоным.
І нясу тры крыжы:
асінавы – на шыі,
зямны – на плячах,
нябесны – у сэрцы.

***

У чыёй буслянцы буслы?
У маёй – вецер.
У чыёй калысцы дзіця?
У маёй – бразготка.

У чыёй печцы агонь?
У маёй – вуголле.

На чыім стале хлеб?
На маім – каменне.

У чыёй рэчцы вада?
У маёй – бруд.
На чыім полі калоссе?
На маім – галасы
галосяць:
адбудуйце гнёзды для буслоў,
адшукайце ласку для дзяцей,
прынясіце крэсіва для агню,
ачысціце плёс для вады.

Нямыя – нямыя…

На чыім полі калоссе?
На маім – галосяць…

***

Іду.
Са мною чатыры цені –
Сучаснасць, Магчымасць,
Забытасць, Істотнасць.
Першы – поруч –
крок за крокам з гаспадаром,
Другі – наперадзе –
падбягае, спяшаючыся,
Трэці – ззаду –
знясілены валачэцца,
Чацвёрты – па шашы –
скалечаны коламі.
Я – пасярод –
разгублены і незапатрабаваны.
Іду.
За мною чатыры цені –
Сучаснасць. Магчымасць,
Забытасць, Істотнасць.

***

Малюся на абраз у куце пакоя –
сповед лунае ў нябёсах.
Удыхаю аблокі гары і пылу –
дыхаю іншым слоем атмасферы.
З паштоўкай зямному сябру шлю прывітанне –
кожны дзень шлю лісты на адрас Сусвету.
Я жыву ў двух вымярэннях
на мяжы зямной абалонкі,
што адлюстроўвае Планету і Бязмежжа.
Не магу ўсвядоміць:
па які бок Планета…
па які бок Бязмежжа…

***

Калі аранжавая чайка
кружыць над ярка-чырвоным акіянам
з бэзавымі крыстамі хваляў,
калі птушка мае чатыры крылы
і не мае вачэй,
калі праз ваду
відаць ядро планеты і магма,
што пульсуе і абвівае
падводныя
гарача-барвовыя
і лядова-сінія рыфы,
утвараючы рознакаляровыя крыжы,
а белы-белы да знікнення,
я не адчуваю цела –
бачу толькі адлюстраванні
ў сваіх зрэнках…
Не будзіце мяне –
мой найшчаслівейшы сон…

***

Калі кроплі дажджу
перасталі сыпацца на зямлю,
а маланка яшчэ адлюстроўвалася ў розных
баках неба,
па халоднай сцежцы,
што вяла ў знаёмае,
але негасціннае месца,
у цёмную далячынь вольнага ветру,
ішоў чалавек.
Ён быў не адзін.
З ім было жыццё…

***

Вецер лашчыў
смоль густых валасоў
зеленавокай прыгажуні.
Праз імгненне
з такой жа лёгкасцю
ён бесклапотна гушкаў
вяроўкі шыбеніц
і лётаў
між калючага дроту.

УСПАМІН

Ля апошняй кветкі лётаў трапяткі матылёк,
Ён нават не спрабаваў сесці на яе:
пэўна, баяўся зламаць кволую сцябліну.
Раптам неба ўздыхнула – і пайшоў дождж.
Адна буйная кропля збіла знясіленага матылька…

Вольны восеньскі вецер перакочваў лісце,
сярод якога нельга было заўважыць
крылаў маленькага вартаўніка.

НАПРЫКАНЦЫ

Прыгажосць.
Што засталося ад яе?
Успамін…
Чараўніцтва.
Што засталося ад яго?
Позірк…
Прывабнасць.
Што засталося ад яе?
Абыякавасць…
Твар зрэзалі
шнары шалёнага часу.
Квецень вачэй
змяніла бясколерная ўсвядомленасць.
Святло,
чысціня
і мара
зніклі.
Нікчэмная рэальнасць…

ПОТЫМ

Зямля,
я пакідаю цябе,
я пакідаю сваіх родных і блізкіх…
Але я абавязкова вярнуся да цябе.
Можа, я вярнуся дрэвам,
можа, я вярнуся птушкай,
можа, я вярнуся рэчкай,
а можа, чалавекам…
Але вярнуся.

***

Белае поле,
а над ім – белы галуб…
Ідзе па полі белы чалавек,

а за ім слядоў няма.
Я клічу яго:
– Паслухай, чалавеча,
што ж ты такое зрабіў,
што за табой слядоў няма?
А ён ідзе, ідзе,
а ў канцы азіраецца,
ідзе да мяне
і кажа:
– Чаго табе, сапраўдны чалавеча?
Я кажу:
– Дык чаго ж за табой слядоў няма?
У яго на вачах
з'явіліся буйныя слёзы.
І адказаў мне ён:
– Вунь бачыш, нада мной
белы галуб ляціць
і ні на крок не адстае –
гэта
ўспамін
майго кахання.

***

У бяздомнікаў –
і ў людзей, і ў жывёлаў –
прадонныя вочы.

***

Чарнобыльскі дождж…
Духам Марыі Кюры
вярнуўся радый.

***

Бабулі Валі прысвячаю

Божа!
Зрабі нас вольнымі,
як птушак,
каб адчуць
вецер цёплы
і мора халоднае,
каб зразумець,
як жыццё
над краем прадоння
вісіць.
Божа!
Зрабі нас шчаслівымі,
як малых дзяцей,
Каб не ведалі жаху,
пакутаў
і злосці.
Божа!
Зрабі нас бязгрэшнымі,
як ты сам.

НІНА МАЦЯШ

***

Я маю толькі імя.
чатыры літаркі –
нібы чатыры бакі свету.
Твор,
мне прадвызначаны
дзеля пераствору
у плынь жыцця.
Тайнапіс лёсу, каторы
спрабую адтаемніць.

***

Слова маё не накліча бяды,
вока маё не злое.
Шчасця твайго не сурочу й тады,
як будзеш ты не са мною.
Толькі аднойчы, пры цёмным акне,
у задуменні мройным
неасцярожна згадаеш мяне –
і смутак ляжа гарою
на ўтульнасць тваю,
на вясёлы твой дзень,
на памяць пра нас абоіх,
дзе я, нібы голачка на вадзе,
трымалася на любові.

УГНЯЗДУЙ МЯНЕ Ў СЭРЦЫ

Пілігрыму ад поўдня да поўдня
Цераз плыўныя нетры часу
Зоўна выбліснуў промень з Усходу:

– Я апірка твая: не будзеш
Выпускаць мяне з рук у дарозе –
Не зняможышся па куп'іску,
Па каменні не падаб'ешся.

Я – апірка твая. І кладка:
Не сцураешся, не разбурыш –
Правяду цябе лёгка, лёгка
Цераз твань і цераз правалле.
Кладка я твая.
І апірка.
І цяпельца на гострых проймах:
І сагрэю я, і разважу,
І ў жарынку сэрца зыначу,
Калі ў сэрца мяне ўбярэш ты
Як святло, як святло Любові.

Калі ў сэрца мяне ўбярэш ты,
Калі мне аднаму слугаваць мешаш –
Успануеш сам над сабою,
Над памрокам і над бядою,
Над ступою між зор, пілігрыме.

Угняздуй мяне ў сэрцы.

ЖАР-ПТУШКА

У мой прыглухлы,
Поўны лета сад
Аднойчы,
Як сухая навальніца,
Зіхотка, бесклапотна, жыццярадасна
Жар-птушка з казкі ў сад мой
Прыляцела,
Прашыла зорным полымем яго,
І кожнае зярнятка ў кожным яблыку

Задыхала з абуджанай маркотай
Сканаць,
Ды толькі цветам прарасці.
Стрывожаны,
Устрапянуўся сад,
А птушка…
Палае двузіхоткае пяро,
Пакінутае мне
Не на ўспамінак:
На тое, каб і ў верасні, і ў лютым
Быў сад мой
Поўны лета.
Каб ён
Быў казкаю.
Азораны. І толькі.

ТРЫПУТНІК

Згубіліся ў натоўпе.
Час гэты
Пастух усюдыісны,
па неўгаданай прыхамаці звёў нас
на міг,
каб вочы ў вочы, –
і з гэткаю бесцырымоннасцю напомніў
пра нашы накірункі і дарогі.
несупадальныя, як нашых пальцаў
адбіткі.

Павечна кожны з нас у загародцы
уласных абавязкаў і правоў.

прыкладваем да сінякоў, да ран
гаючы
трыпутнік той сустрэчы.

ПЧОЛКА

Сшывае лёс крывой іголкай
Памкненні й чыны ніткай скрухі.
Душа нектар свой,
быццам пчолка,
усё шукае ў полі руху.

Нічым пагрэбаваць не можа,
хоць не заўсёды патрапляе
з падзейнай наквеці варожай
жывіцца тым, што прасвятляе.

І мус уроку паўтарацца,
пакуль не ўсвоіцца належна,
што не ад змены дэкарацый
спектакль
і ролі ў ім
залежаць.

ВЫЗВАЛЕННЕ

Зярнятка радасці маёй,
Карэньчык сонца ў золкай долі!
Яшчэ скавана мітуснёй –
І ўсё-такі я ўжо на волі.

Яшчэ цягну ярмо тугі
і неразважаных сумненняў,
ды ўжо мне шлях той дарагі,
дзе ў кроў саб'юся аб каменне.

Хачу сама таго ярма!
Бяда вяшчунна пратрубіла...
Бяда старалася дарма:
З мяне рабыню не зрабіла!

Яшчэ скавана мітуснёй –
і ўсё-такі я ўжо на волі!
Зярнятка радасці маёй,
Карэньчык сонца ў золкай долі...

СУГУЧЧА

Не моўкне сонечнае рэха,
сугучча наша доўжыць, доўжыць –
бы ты нікуды не паехаў,
бы ты ўсё побач
і ўсё той жа –
пяшчотны, ўсмешлівы, шчаслівы,
увесь у песеннай уладзе –
як жаўранак над яснай нівай,
як шпак у развяснелым садзе!..

ты ўсё, усё мне,
ўсё на свеце:
і кліч жыцця,
і прага смерці...

***

І прыйдзе ноч, і ноч міне,
і дзень навекі разамкне
іІ аглядзіцца навакола.
Ці будзе рады й мне?

Ён – грук матораў, шоргат шын,
ён – самалётны рык вышынь, –
што для яго пялёстак кволы
ссамотненай душы?

Па бровы ўкутаму ў браню,
пялёстак той, як парахню,

бязлітасна пусціць на вецер
было б так лёгка дню, –

калі б у непрыманні зла
душа змагарна не ўрасла
у заўтрае надзей бяссмерцем.

ВЯСЁЛКА

Хмары з самага ранку – набраклыя,
шызыя.
Дождж ад самага ранку няўтомна
плюшчыць.
Аж не верыцца ў золкасць за мокраю шыбаю:
Ціхамірна і соладка на сэрцы трывушчым.

Мілы, што гэта?!. Што ты...
зусім і не плачу я.
Пачакай... парушынка да вейкі прыпала...
За ўсё лета ні разу вясёлкі не бачыла –
Аж цяпер вось у небе асеннім заграла!..

***

Цені ў кутках, як блакітная варта…
Сёння мы ў шчасця ў гасцях.
Можа, адзіна цяпер мы і варты
Жыцця.

Сёння, калі нашы душы пад знакам
Злітнасці і паўнаты;
Зараз, калі ў іх ні следу ніякай
Лухты.

Выстыў даўно ў белых кубачках чорны
Чай на вячэрнім стале…
Спеўна і вольна, нібыта на горнай
Скале!

Лёгка, як птахам уразлівым дзікім
З гордым узмахам крыла!
Цені, як варта блакітная…Лікі
Святла!..

ДАРОСЛЫЯ ДЗЕЦІ

Шукаем у спадарожніку
нават не водбліск, не водцень, не водгалас,
а ўсё нашае ўласнае “я”
у найлепшым,
у найдасканальшым яго варыянце, –
без ніякіх гарантый,
але з верай, што –
знойдзем!
А потым –
а так неўзабаве –
слёзы, і крыўды, і роспач
з укарэньваннем у зацятасць,
а потым –
атрутная калючына цярновая,
увагнаная ў сэрца сёння там,
дзе ўчора гойна тулілася
да нясцерпу жаданае
абяцанне
апошняга пялёстка рамонкавага,
яго залатая зазнака
любасці і пяшчоты.

***

І ветрам звейваліся,
і натоўпамі затупліваліся,
паліліся апоўдні сонцам,
а апоўначы
з усякім смеццем разам

змываліся вадой, наплыўнай
з-пад парыжскіх тратуараў,
сляды ног нашых.
…Ды вось –
Выглядваюць,
жывыя,
з закануркаў памяці
І нам вяртаюць
Не сухаліст вандроўкі,
А востры водар квету
Духу чалавечага
І да людзей любові.

***

Пры сцежцы
Гарыць куст ружавы.
Мінаюцца з ім людзі
І зрываюць
Дзівосныя бутоны.
Рукі ж мае –
пустыя.
Бо сцежка не мая?

***

Даўні сон:
Усё ніяк не дапускае нешта
здаць
Экзамен па замежнай мове.

…Усё ніяк, відаць, не выспеліцца
Нейкі мусовы плод
На голлі маёй дніны.

***

Звычайны,
беспадзейны
дзень.
Нічога не чакалася,
І ўжо нічому сёння не адбыцца.
Лілейкай гойдаецца сэрца
у затоцы
Пяшчоты невытлумачальнай…

***

І.Ул. Баярчуку

Недзе ўзважваецца наш унёсак
У Жыццё
ў зямной гэтай юдолі.
Ці адхмарацца калі нябёсы?
Ці нап'ецца сэрца шчасця ўволю?

Будзем помніць: ледавік сыходзіць.
Будзем помніць: і патоп мінае.
Хоць здаецца, сілы на зыходзе,
Крык душы ў пустыні прападае…

Але сіл даецца роўна столькі,
Колькі трэба, каб стрываць пакуту.
Ветрам хіліцца да голькі голька,
Кожны лісцік хоча быць пачутым…

ТВАР У ТВАР

Маладая,
Нібы расінка на лістку баравінкавым,
Наструнена прыкіпела
Ля калыскі свайго немаўляці,

Не ў сіле адвесці вачэй
Ад чужога калецтва:
На калёсках
(не мае ног)
Па вуліцы рухаўся
торс чалавечы...
Скрып калёсак старога салдата,
Ледзь улоўны звон медалёў
Нясцерпным набатам званоў хатынскіх
Біў у скроні жанчыны,
І ў ажынавых зрэнках яе
Перахліствалiся пякліва
Боль,
замяшанне
і страх,
А ў зграбнай паставе застыла
Насцярожанасць рысі:
Трапяткая рука захінала міжволі,
Усё захінала
карунковай накідкай
калыску...

***

Жыццё яшчэ сваё не кажа "не",
Жыццю яшчэ відочна даспадобы
Мяняць на ласку дзіўную свой гнеў,
Світанне радасці
тугой аздобіць,
Падступна стому сэрца падаслаць,
Каб ёй у твар змагла я рассмяяцца,
Каб між людзей быллём не парасла
Мая сцяжына помыслаў і працы.

УЛАДЗІМІР НЯКЛЯЕЎ

ГАЛУБІНАЯ ПОШТА

Блакіт галубіных палётаў,
Сінеча настыглай вады,
Адчынены ў восень вароты,
Засыпаны ў лета сляды.

Іржышчам, па колішнім жыце,
Бяжыць басанож дзетвара…
І ўсёт-кі, хто знае, – скажыце,
Якая ў сусвеце пара?

Скажыце: куды і навошта –
Над пожняй, над полем пустым –
Гадоў галубіная пошта
Нясе расцярэблены дым?..

СТУДНЯ

Сасмяглай рыбай боўтнецца вядро…
Затархаціць пашчэпаная корба…
Адзін глыток – і вось яно: дабро!
І жыць на свеце хораша і добра.

Абуджан зрок: мільгне птушыны цень…
І слых: у ліпах пчолы зноў шчыруюць…

На жоўты жвір сцякае з рук струмень,
І на вадзе каменьчыкі танцуюць.

ПАЛАНЭЗ

(урывак)

Бывай, Яблонская, бывай!
Прабегла восень па фальварку –
І графіка такая ў парку,
Хоць парк у раму забірай...

Бывай, Яблонская, бывай!
Я застаюся па-за рамай
Карціны, што праз дождж відна:
Раяль, камін – і ты адна,
Стамлёная любоўнай драмай,
З бакалам белага віна....

Апошні раз прыгубіць дай –
Заторгні на карціне шторы!
Я кінуў твой пякельны рай,
Грукоча ў ночы поезд скоры:
Бывай, Яблонская, бывай!

Не стаў бакал на самы край!
Святло і цень дрыжаць падманна –
І ўсё разрывіста, туманна...
Цалую рукі, ясна панна,
Бывай, Яблонская, бывай!

Ад клавіш рук не адрывай!
У свеце, дзе вішчыць жалеза,
Пранізліва гучыць няхай
Акорд апошні паланэза –
Бывай!

СТАЎ

Басанож прайду па пожні
Да мяжы, дзе цёмны стаў...
Так настане дзень апошні,
Як і кожны наставаў.

І ў замежнай той старонцы,
Дзе я страчу ўсё і ўсіх,
Не заплачу я па жонцы,
Па каханках па сваіх.

А па кім жа я заплачу
На мяжы, дзе цёмны стаў?
А па той, якой не бачыў,
Той, што ў свеце не застаў.

Па адной
нецалаванай,
Той, якой не цалаваць,
Па адзінай,
неспатканай,
Той, што Бог не даў спаткаць.

***

Якая адзінота, Божа мой,
Па лініі ідзе берагавой,
Кіруючыся зменлівым абрысам,
Спыняецца, стаіць пад кіпарысам
І кідае каменьчыкі ў прыбой.

Яна сябе адну аберагае
Адна,
а як наблізіцца другая,
Дык за вярсту другую абміне...
Каменьчык кіне – хваля набягае,
Каменьчык кіне – хваля адхлыне.

Віна на дне суціхла, адзыбела,
І не згадаць, з чаго душа збалела, –
Так... нешта мімалётнае... капрыз...
Аточаны ажурнай пенай бераг.
Гайдаецца на хвалі ветразь белы.
Хістаецца на ветры кіпарыс.

КОСМАС

Аднойчы, прачнуўшыся ўночы,
Ты ўспомніш, што ўмееш лятаць,
І стане наіўныя вочы
Халодная бездань смактаць.

І зманлівай згадкай быцця
Цябе працяній аж да поту,
І ўласнае станеш дзіця
Вучыць не хадзе, а палёту.

***

Неба застаўлена пасткамі,
Глянеш – і цягне ў нябыт...
Што ты згубіла ў ім ластаўка,
Бліскаўка, метэарыт?

Там, пад сінечаю цупкаю,
Зор захінаючы раць,
Воблакі, сшытыя дзюбкаю,
У бліскавіцах гараць.

Што ты шукаеш там, мілая?
Там без цябе ўсё было,
Швейка мая хуткакрылая –
Спаленае крыло.

***

Малітвы.
Клятвы.
Споведзі.
Законы.
І неназваным Бог дае імёны,
Каб доўжыць род, асуджаны на звод,

Чытаюцца, але наадварот,
Нябёсаў таямнічыя пісьмёны
Настылай плыні раўнадушных вод.

Праклянцці.
Здрады.
Вераломствы.
Бітвы.
Хай Страшны суд, нібы да шыі брытва
Усё бліжэй – што будзе на Судзе?..

Калі на плыні
сам Гасподзь ідзе,
Калі ўсе клятвы, споведзі, малітвы
На хуткаплыннай пішуцца вадзе.

***

Пералётная птушка зламала крыло аб драты
Каля бацькавай хаты.
І крычыць, як жалеза пілуе, яна:
“Гэта ты! Гэта ты!
Гэта ты вінаваты!”
І на крык яе
кругам
вяртае важак чараду –
Што ён стане рабіць?..

Вёдры ў хаце пустыя…

Так страшна ісці па ваду,
Быццам
Будуць
Бамбіць.

ЗЕМЛЯТРУС

Радок у Апакаліпсіс...
З карцін
Глядзяць святыя, што зруйнуюць Мекку.
Па камянях, адчуўшы небяспеку,
Бягуць звяры з пагібельных мясцін.

Сустрэчнымі шляхамі перад тым
Прабеглі людзі – прочкі род ад роду,
І, скалануўшы ў ярасці прыроду,
Пасеялі пустое на пустым.

Нянавісць на нянавісць,
Гнеў на гнеў,
На попел – попел
І на порах – порах...
Чакаючы малітвы і пакоры,
Чаму, Гасподзь, ахвяр ты захацеў?

Ты ў камені, ці ты ў агні, ці ў ветры –
Гасподзь, як ёсць ты, адгукніся хоць:
Тваёю воляй зрушыліся нетры,
Ці над табою воля ёсць, Гасподзь?

У САДЗЕ НАД РАКОЙ

Несупадзенне дат.
Несупадзенне вех.
Вяртаецца назад

Даўно забыты снег.
Узняў забыты дождж
Крыштальнае крыло.
Усё было – і ўсё ж,
Што будзе – не было.
І ў садзе над ракой,
Чырвоным ад калін,
Пружынай
Пад рукой
Напружанне галін.
Галінку адпушчу –
Мільгне за далягляд,
І вернецца назад,
І вернецца назад.

ПЫЛ ДАРОГ

Ці пясок залаты ён, ці смецце –
Пыл дарог, што круцілі па свеце?..
Мітусня!
Вызваляюся.
Вецер
Лёг ля брамы ў нядрэмны дазор,
Як сабака.

Бы сховы разор,
Дні спусцелыя...
І на дасвецці
Вызваляецца неба ад зор.

***
Ані царквы ў крыжох,
Ані хаціны боскай...
Так і жывуць удвох:
Богам забытая вёска,
Вёскай забыты Бог.

***

Восень. Сівізна ды пазалота.
Веерам раскінецца лістота,
Змеценая ветрам да акна.
Адзінота, друг мой, адзінота.
Налівай віна..

Сядзем. Памаўчым ды пагаворым.
Дзякуй Богу, тут ніхто не хворы,
І няма пытання: піць ці не?
Апрыёры, друг мой, апрыёры:
Ісціна ў віне.

Хораша сядзім. І п'ём са смакам.
За сцяной сусветнага барака
Вые недарэзаны сабака
У глухія, шэрыя палі.

А на шклянках – знакі задыяка,
Вершы па кутах – хоць печ палі.

Будзь.
Як той казаў:
хай скажуць дзякуй
нам, што мы пілі.

ЗНІЧКА

Ля самай скроні свету
Слізне і прападзе.
Ні водгуку, ні следу
Нідзе, нідзе, нідзе.

А свет сабе гудзе,
Як перад святам пошта.
Слізне – і прападзе.
Адкуль? Куды? Навошта?

Праз ніцы вербалоз –
Сцяжына ў вольным полі.
Адно і ёсць – што лёс.
... А што бывае болей?

АНЁЛЫ

Як час настаў –
і рушыў я да Бога,
Анёлы – тры – мне перайшлі дарогу.

Адзін спытаўся: "Ты куды ідзеш?.."
Другі спытаўся: "Што з сабой нясеш?.."

А трэці не спытаўся анічога.
Ці быў нямы –
ці знаў, што я да Бога.

СЯРГЕЙ ПАНІЗЬНІК

ВАЛАДАРСТВА СЛОВА

"Бо тыя, што служылі зоркам,
зоркамі ж былі навучаныя..."

Бэтлеем на краявідзе
пазнаваў мудрэц і хлус:
там народзіцца Збавіцель,
заўладарыцца Ісус.
Углядаючыся ў высі,
прадчувайце д'ябла зман:
дзе народзіцца зламысьнік,
заўладарыцца тыран.
Хай нябёснае праменьне
выявіць і наш сакрэт:
нараджаецца сумленьнік –
прапаведуе паэт.
Не бясконцы час тырана:
вечны ў дабравесьце Бог.
І паэт з адкрытай ранай
стане сьветачам дарог.
А пакуль з паглядам ніцым
ходзім па шляхох ліхіх –
ля амбона і званіцы
ні прарокаў, ні святых.
Дзе ты, наша ўзнагарода
з Бэтлеемаўскіх дароў?
Мова – яселькі народа.
павітуха змагароў.
А паэзія – ня джала, –
родных словаў запавет:
будзе зоўнаю дзяржава, –
стане зоўным і паэт.

ДОЙЛІД І ДОЎБНЯ

Агонь патух…
Тапор апух:
сьсякаў сукі,
зразаў цвікі,
часаў дубы…
Цяпер – тупы.
Плыве сьляза:
няма ляза…
Ва ўсіх звон струн.
А ён – калун.
Ва ўсіх ілбы,
Абух – слабы…
І як тут быць?
Пад лаўкай выць?
З даўбнёй
ні трэсак, ні агню…
Цясьлярства любіць
в а с т р ы н ю.

ЛУЧВО

Зьмітру Санько

Дзьве скалы – вясна і восень.
Пасяродку – лета.
Для ратая і паэта
дарагою – просінь.
Як зямля, так і папера
памагалі продку.
Дзьве скалы – душа і вера.
Мова – пасяродку.

СУСЕДНІЦЫ

Быў для Масквы
і для Крамля
мой Дом –
імпэрскаю ускраінай.
Без галавы
і без камля
душа ліпела, ўся паранена.
Асеў вушак,
стаў набакір.
Краіна вольнай называецца.
Мне б наўскасяк,
ды свой вампір
мацней за прыхадня кусаецца.
Эўропы пуп –
у нас! Праз нас
Вараг і Грэк плылі караблікам.
Нясу на зуб
я свой прыпас –
з Масквы, з Крамля
паслам і скарбнікам.
Радні – паклон.
Сябрам – хада
да ветлай беларускай весьніцы.
Мы – не рабы. Вы – не арда.
Якая будзе любата:
Расея, Беларусь – суседніцы.

"ФРАНЦУЗ"

Памяці майго дзядзькі Аляксандра – шахцёра, францірора (вольнага стралка) Руху Супраціву ў Францыі

Ехаў ад родных Мёраў
у дэпартамэнт Норд.

Францыя францірораў –
добраахвотны фронт.
З-пад эмігранцкіх зораў
вывез калецтва груз.
Францыя францірораў –
хутар, дзе жыў "француз".
Не абысьці разораў,
не запрасіць сяброў...
Францыя францірораў –
рэха ад ваяроў.
Жальбы свае агораў
і прастагнаў: «Пара»…
Францыя францірораў –
вывезена з двара.
Вольны стралок шахцёраў
слухае сьпеў сасны.
Францыя францірораў –
зь межамі ля Дзьвіны.

СВЯТАЯННІК

Святаянскае зелле (зелле святога Яна) – расянка, крывавец, зверабой, дзюравец – дапамагае ад 99 хваробаў.

На разуквечанай паляне
Шчыкоча ногі мурава.
Знайшла бабуля святаяннік
І – пасвятлела галава!
Бабуля вехцік асвяціла,
На покуць ставіць на паклон:
Цяпер прыроды нашай сіла
Ля Бога заняла свой трон.
Любую немач пераможа,
Маркоту з тварыку згарне…
…Калі паверу – дапаможа
Замова зельная і мне.

ВЕЧАР НАД ХВАЛЯМІ РЭЧКІ

Маладзічка
Гарбочак
Ноч
Нячутна
Счэрпне.
Шчымлівы
На сустрэчы
Чуйны
Чэрвень.

Чый
Чорны
Човен
У чаратах
Шапочых?
Пачуў я
Кліч:
Чакае
Вечар
Ночы.

СОН У ПУШЧЫ

Задрамаў звярыны стан.
Разам з лісам, чынна
Лёг паспаць мядзведзь-туман
У сваю лагчыну.
Да карэньчыкаў прырос
І травінкі кожнай.
Чуць дрыжыць казулі нос
Над бухматай пожняй.
Заўтра будзе птушка – роскай-весялушкай.
А пакуль што ў пушчы зубранятка чуе:
На птушынай дзюбцы цішыня начуе.

Задрамаў звярыны стан:
Заяц, воўк, яноцік.
І з вавёркаю кажан
Спіць у роцік роцік.
Барсуку, дзіку – як дар,
Пушчы зберагу я
Росных берагоў нектар –
Волю дарагую.
Заўтра будзе птушка – роскай-весялушкай,
А пакуль што ў пушчы зубранятка чуе:
На птушынай дзюбцы цішыня начуе.

ЖНІВЕНЬСКАЯ КУЗНЯ

Бяроза
карою-жабрамі
Глытае гарачыню.
І нават стаіўся жаўранак,
Не ўзняўся
у вышыню.
Пры кузні
сонца стараннае
Працуе не для красы:
Куюцца
чатырохгранныя
Стозёрнавыя
каласы.

КАРАГОД

Хто ў нас водзіць карагод?
– Я – Рамонак.
– Я – Асот.
– А я – кветка-Чамярыца.
– Я – калючая Ігліца.
Ох, які прыйшоў народ
На вясёлы карагод!
Карагод – кожны год.
Кожны дзень – карагод.
Зоркі з неба коцяцца –
З намі карагодзяцца.
Хто ў нас водзіць карагод?
– Я – Сарока.
– Я – Удод.
– А я – Бусел даўганогі.
– А я – Воран вельмі строгі.
Ох, які прыйшоў народ
На вясёлы карагод!

Хто ў нас водзіць карагод?
– Я – Вавёрка.
– А я – Кот.
– Я – Пушынка-аблачынка.
– Я – Алег.
– А я – Марынка.
Ох, які прыйшоў народ
На вясёлы карагод!

Карагод – кожны год.
Кожны дзень – карагод.
Зоркі з неба коцяцца –
З намі карагодзяцца.

***

Былі сустрэчы, разьвітаньні.
... Стаю пад продкавым крылом.

Пакуль жыву –
спыняй, Каханьне,
трымценьне цені над чалом.

І на адхоне зьдзірванелым
затрымлівай мяне ўсяляк…

Любоў – не прыдарожны знак:
шытво
паміж душой і целам.

ЛАВІЦЕ МІГ

Лавіце шчасьце на ляту!
Лавіце вецер!
Лавіць варон я не пайду:
настроіў венцер.

Лавіце шэльму ў каламуць
і страх лавіце…
Злавіць сябе ты не забудзь
на слове - крыўдзе.

Трымайце злыдня за каршэнь,
хапайце воўка!
Шкада: ў пустым таку мышэй
лавіць нялоўка.
Лавіце міг, пакуль жывём;
закіньце вуду…
Вунь амазоначка з канём…
Лавіць ня буду.

Кап'ё…Аброць…І неспакой
прабіўся з нетраў:
мне пад яе тугой рукой
лавіць паветра…

МАЛІТВА НА АБАРОНУ АЙЧЫННАГА МАЦЕРЫКА

Я – матуліна крывінка.
Я – зялёная былінка.
Сёння молімся на кроны
Усявышняй абароны.
Родны Божа,
Памажы!
На Айчыну
Узлажы
Светлы покрыў
Абаронны.
Мне расці і – усміхацца.
Мне цвісці, укараняцца.
Нашы светлыя часіны
Узняліся з-пад ільдзіны.

Родны Божа!
Навучы
Палюбіць
І зберагчы
Мацярык,
Для ўсіх адзіны.

ЗГУКІ НОВАЕ КНІГІ

***

Ёсьць што сказаць таму,
хто хоча паслухаць.
Апошняя помста жыцьця – трызьненьне.

***

Ад скразьнякоў дзяржавы
пяршыць у горле.
Азонавае покрыва – мова.

***

Прыпазьняецца час.
А хвіліны – навыперадкі.
Пішу па памяці.

ПІМЕН ПАНЧАНКА

ЛЯ ЖЫТА

Калі я ўспомню
Аб перажытым,
Жыцця гартаю
Спісаны сшытак.
Пачуць хачу я
Дыханне жыта.
Не скіба хлеба –
Душы патрэба.

Па радыё знарок
Крычаць штодня пра брак,
То аглушае рок,
То лекцыя пра рак,
То Дэбюсі,
То Бі-бі-сі…

І не заменіць
Радыё-няня
Ні калыханкі,
Ні калыхання,
Ні матчын голас,
Ні спелы колас.

Не расшавеліць
І не спакусіць
Ні грошай шэлест,
Ні хітрасць хлусаў.
Мы адшумелі,
Маўчым, маўчым,
Нібы шумеры
Ці крывічы.

Стаю ля жыта,
Малюся жыту,
Пішу пра жыта,
Ізноў пра жыта:
Умее жыта
Душу лячыць.
пакінь, зязюля,
гады лічыць!

Жаўранка песня
Ў небе дрыжыць…
О божа мілы,
Як добра жыць!

ЛЮДМІЛА ПАЎЛІКАВА-ХЕЙДАРАВА

АСЦЯРОЖНА – ЛЮБІМЫЯ!

1

Там, дзе звівае гняздо сабе небыль,
Дзе вышай гары быў сардэчны парыў,
Я аддала табе круглае неба…
І ты на ім нежыць сваю пасяліў.

Край у жыцця стаў ірваны і востры,
Дзе стаўся скалістым у долі абрыў…
Там я сястру аддала табе ў сёстры,
І ты яе дзевай распуснай зрабіў.

Трудны быў дзень на зямлі ад любімых.
Цямнота да бязданяў сэрца ляціць
І невідушчымі зрэнкамі міма
Глядзіць…

2

Пад раніцу пашчасціла заплакаць.
Дзве-тры слязінкі выпалі з вачэй.
З каленек долу скочыў наш сабака,
Цяпер нічый, ужо нічый яшчэ.

У строгасці засцеленай пасцелі
І невядомай, пругкай цішыні –
Ўрачыста, нібы птушкі адляцелі
І ззяе даль у золкай чысціні.

Але ўначы дажджыла на зямлі.
Стаяць на шкле вільготных кропак знакі.
І вось ужо – ні дома, ні сям'і
І, можа стацца, нават ні сабакі…

3

На досвітку прад мамінай іконай
Я азірнулася назад апошні раз…
Ну вось і ўсё – ні клічу, ні праклёну.
Любімыя, я ўкленчыла за вас.

Апошні раз. Так робяць на растанне.
Няпомныя без полагу прыўкрас.
Абліччы калыхаліся ў тумане…
Любімыя, я не пазнала вас.

Апошні раз... Як трэба асцярожна
З прахожым разміноўвацца падчас!
Ну вось і ўсё – мінулі раздарожжа.
Любімыя, я не пазнала вас.

На вышыні, дзе твар забыты Бога,
Як станчым на зямлі апошні вальс,
Адзінае, што ўспомніцца з былога:
Любімыя, я не пазнала вас.

4

Падтаяў снег і абарваўся з даху...
Глядзіць зара ў высокае акно.
Здаецца, так было даўным-даўно –
Празрыстасць фабраў і пяшчота пахаў.

Здаецца мне, што гэта – назаўжды,
Як прышласць і як дальняя дарога –
Над комінамі лёгкі, дрогкі дым,
І снег сівы, як голаў у старога...

ЮНАЧЫ ПАЎСТАНАК

Адгрукоча ліпеньская ноч
цягніком па соннаму паўстанку,
я пакіну белую альтанку,
што ад Шляху Млечнага наўзбоч,
і знямею ў роспачы, калі
пройдзеш, зачапіўшы боскім ценем…

Трэба ўсё зямное прыцягненне,
каб мяне ты згледзеў на Зямлі.

***

Прывідна плылі над светам белым
аблачын лятучыя гандолы.
Мройліва імжэў, як срэбны вэлюм,
дождж, не далятаючы да долу.

Сны, нібы кароткія сустрэчы,
як пагляды ўслед за цягнікамі.
Дні былі, як тоненькія свечкі –
нават не паспееш мовіць "amen"-

Нібы ўсё скупілася. А потым –
суш была. Вялікая. Да згубы…
Ціша на душы. І стыне попел.
І гараць патрэсканыя губы…

***

Кастрычнік. Празрыстыя, чыстыя далі.
Дапіта былога віно.
І тое, пра што мы калісьці гадалі,
мінулым завецца даўно.

Уславім з табою мінулага старасць,
і цішу яго, і грамы
пад пылам забытай, разбітай гітары,
дзе тройчы разбітыя мы…

***

Калючым лугам памяці,
што скошан,
прыходзім паасобку мы сюды –
у жнівеньскія зорныя парошы,
у сінія світальныя сады.
Прыходзім…
Так вяртаюцца дамоў
з усмешкай незнаёмаю на твары,
так вырастаюць скошаныя травы
перад зімой…

***

Сустрэліся
аднойчы ў жыцці
два лёсы
з тварамі,
што хмарамі.
Не перуны,
не бліскавіцы
ірвалі неба
долі ніцай,
а проста,
перш чым парадніцца
два сэрцы
мераліся ўдарамі.

***

Зайшоў па дарозе ў ноч
няголены, злы, калючы,
старожкі, што крок над кручай,
вечар стамлёных воч,
вуснаў, што пахлі дымам…

…Дзякую, што не міма.

ЛЮБОЎ

Павадзіла
дрыгвой
і над кручамі,
долу кідала
з-пад аблачын.
Адлягла,
адхістала,
адмучыла…
Мірна спіць
на маім плячы.

***

Разліваюся па сэрцах,
па вачах – нібыта чарах,
дастаю глыбіні смерці,
абдымаю шар абшараў
і аб сценкі жылаў б'юся
жыцця даўкага, зямнога,
не лічы – удараў пульса,
проста – сонца стала многа
тут, дзе хвалі ў сінім моры
паўстаюць, каб зноў упасці,
я ўзнімалася – у горы,
навучы – як жыць у шчасці?

***

Душу і зрок ва ўсе часы
я намагала да слязы…
І раптам вочы нагадалі:
пара не бачыць драбязы,
прыйшла пара глядзець –
у далі.

АЛЕСЬ РАЗАНАЎ

***

Перакладаю шэпт дажджу,
пагляд вачэй,
трымценне гаю…
Кранаю,
слухаю,
гляджу,
я не пішу –
перакладаю.

***

Спазніўся ўстаць
і спазніўся легчы,
спазніўся пачаць работу
і спазніўся скончыць –
і пачалі мяняцца
месцамі дні і ночы,
вынікі і прычыны,
і я апынуўся
насупраць самога сябе.

***

Залевы.
Дражняць міражы.
Гудуць вятры пры падыходзе...
Мы кожны дзень на рубяжы
былых і будучых стагоддзяў.

***

Той крок,
якім я не здолеў
ступіць напрасткі,
ператвараецца ў мноства крокаў
па крузе.

***

Што будзе з намі? –
Клінам свет.
Што будзе з ім? –
Няўжо дарэшты?..
Гасподзь не ведае як след,
Гасподзь вядзе эксперыменты.

***

Развей няведання туман
і адкажы нам,
непазбежнае,
ці гэта час належыць нам,
ці гэта мы яму належныя?

***

Шукаем ісціну.
Сцюдзёна
яна ў азоне і ў вадзе...
Яе не знае здавалёны,
яна сасмяглага вядзе.

***

З дзівотнай вечнасцю ў хаўрусе
да супярэчнасцяў прывыкну.
Застацца каб! – не застануся.
Бясследна знікнуць бы – не знікну.

***

Здасца, што ўсё ўжо было:
позірк, пяшчотны і чулы,
сонца ў лісці і крыло,
што ў вышыні мільганула.

***

Каб дачакацца,
не хапіла хвіліны,
каб назаўсёды расстацца –
хапіла якраз
хвіліны.

***

Калі ўсё наўколле
я ведаў на памяць,
тады ўзяў у павадыры
незнаёмага чалавека –
і сцежкі скрануліся і павялі
ў невядомасць.

***

Сцежка па-над абрывам:
па ёй прывабна ісці,
на ёй кожны крок
змястоўны.

***

Парастак, што прабіўся
праз пласт асфальту, –
усе пешаходы
табе саступаюць дарогу,
быццам вялікаму дрэву.

***

Дрэмле на летнім дажджы
спутаны конь –
спутаная прастора.

***

Думаў аб вечнасці.
Чорна-чырвоны матыль
прыляцеў,
сеў мне на руку,
стаў думаць разам са мною.

***

Спрачаюцца людзі ў чарзе,
а ззаду,
за ўсімі
стаіць самотнае неба
і ўсім уступае сваю чаргу.

***

У апусцелых дрэвах
пустое гняздо:
мінула,
пакуль яго ўбачыў,
лета.

***

Летні раптоўны дождж.
Я прытуліўся
да ніцай вярбіны —
і мноства лістоў на мяне глядзела,
нібы здзіваваныя вочы.

***

Такія розныя людзі,
дарогі,
лёсы,
а вось жа сышліся разам:
чакальня на аўтавакзале.

***

Убачыў на вуліцы, у прыцемках,
чалавека,
надзвычай падобнага на майго –
ужо нябожчыка – бацьку.
О як мне хацелася
ўслед пайсці,
о як мне хацелася папытацца:
хто ён?!.

***

Бабуля з пад'езда:
усё цяжэй ёй спускацца па лесвіцы,
усё цяжей падымацца,
усё цяжей заставацца дома.

***

Заляцела ў пакой пчала –
зумкае,
б'ецца ў шыбу
і не знаходзіць выйсця.
Гэтак і мы ?!.

***

Дзядоўнік,
палын,

крапіва расказалі,
што ў гэтым двары
ужо ніхто не жыве.

***

Дзівосныя рыбіны –
уначы
плаваем у бязмежжы,
а ўдзень
блукаем па сушы,
шукаючы ў ёй
рэшткі страчанага бязмежжа.

***

Паўрасталі ў зямлю
замшэлыя камяні
з незразумелымі літарамі:
на зямлі
нікога не засталося,
хто змог бы іх прачытаць?!.

***

Які агромністы дом!
тут што ні дня
то свята,
а то жалоба.

***

Уранку я выйшаў з дому
і ўвесь дзень ішоў
у кірунку да сонца.
Якім супярэчлівым аказаўся
мой шлях!

***

Ці чуеш,
асушаная балацінка:
кнігаўкі прыляцелі?!.

***

Усё змясцілася ў маім целе:
безліч вякоў,
безліч жыццяў,
а сам я –
не.

***

Справы,
якія здаваліся неадступнымі,
адступіліся...
Вось і ты вольны, –
сказала ўранку душа.
А ўвечары дадала:
і лішні.

***

Уздоўж начнога перона
такія самотныя ліхтары,
быццам прыйшлі
кагосьці праводзіць
і не могуць успомніць – каго.

***

Леташнія аб'явы:
чытаюць іх адно толькі
вецер і дождж,
пакуль
не прачытаюць дарэшты.

***
Расклалі ля рынку
цяпельца
і грэюць рукі
армяне ў Менску.

***
Зона.
І як вы зайшлі,
бярозы,
туды – за калючы дрот?!.

***
Дрэвы ўскрай прорвы:
стаяць,
бы схапіліся ў бітве з лёсам:
лаакаоны.

***
Гром загрымеў –
і адразу
аціхлі ўсе галасы:
нябёсы гавораць!

***
Адліга.
Вада
разводзіцца з снегам.

***
Світае –
так паволі,

так неахвотна,
нібы засталіся на цэлым свеце
насельнікамі адно толькі шэрыя камяні.

***

Каля зялёнага дрэва
скульптура з дрэва:
маўклівая спрэчка
пра дасканаласць.

***

Зялёны мох на страсе –
песнаспеў зялёны
асенняму хмураму небу.

***

На заінелым трамвайным акне
хтось напісаў:
“Я кахаю”.
Усе пазіраюць на свет
праз гэтыя словы.

***

Не вернецца воін,
Вандроўнік не вернецца,
Вернецца сейбіт…
Заўсёды
Вяртаецца сейбіт.

***

Блукаюць сны
у лабірынце розуму

і ў снах
блукае розум –
шлях людскі.

***

Блакіт нябёсаў,
луг стракаты
больш не ўзрадуюць таго,
хто страціў сэнс,
бо сэнсу страта –
то, пэўна, страта усяго.

***

Звон зазваніў:
прастора
займела цэнтр.

***

Афарбавалі ў парку
замшэлы валун –
і памерлі
стагоддзі.

***

Усё мінае, – сказаў мудрэц,
І ўсе з ім згадзіліся.
Аднак засмяяўся непадалёку дзіцёнак,
і ўсе, азірнуўшыся, успомнілі:
і настае.

МІХАСЬ СКОБЛА

КОТ І МЫШКІ

Кот Базыль катаўся ў гамаку,
На абед пасёрбаўшы са смакам
З малаком густога панцаку
Ды заеўшы абаранкам з макам.

Кот заплюшчыў вочы, муркатаў:
–Каб жа мяне хтосьці пакатаў.

Мышкі, не хавайцеся ў нары,
Выставіўшы вонкі каптуры.

Хочаце, я кожнай у каптур
Пакладу цукерачку – мур-мур.
Шчасця вам жадаю і спакою.

Выйшлі мышкі дружнай талакою.
Падхапіўся хітры кот Базыль…

Хто далей раскажа казку-быль?

СКАРБ

Мне сказала мышка-палёўка…
А пра што – я вам ні гу-гу.
Дзе ты, дзе ты, мая рыдлёўка –
Ёй адной расказаць магу.

На гародзе ў бабкі Агаты,
Дзе растуць агуркі й часнок,
Шмат гадоў таму пан багаты
Закапаў залаты збанок.

Залаты збанок ці куфэрак,
Што блішчыць дыяментамі аж.
Гэта ж колькі будзе цукерак,
Як занесці яго на кірмаш!

Я стараўся, капаў, бы крот.
Раскапаў увесь агарод.

Падкапаў і падмурак хаты –
Скарб, няйначай, пад ёй ляжыць.
Толькі бабкі шкада Агаты,
Дзе ж тады яна будзе жыць?

ПАЛЁТ

Купалы царквы – як паветраныя шары,
Надзьмутыя лёгкім дыханнем ладану,
Прывязаныя да зямлі
Тонкімі срэбнымі ланцужкамі
Дзіцячых галасоў на хорах.
Пад нязмірглівым позіркам свечак
Купалы летуценяць
Пра вольны завоблачны свет.
Гатычныя вежы касцёлаў
Нецярпліва ўздрыгваюць
У прадчуванні імклівага старту,
Прыкінуўшыся міжзорнымі караблямі.
І ў гэтым замёрзлым чаканні
Уся Заходняя Беларусь
Нагадвае вялізны касмадром.
Але прыгажей за ўсіх
Узлятаюць кітайскія пагады,
Глядзіце – яны ўжо прыселі
І ўзмахнулі павольнымі крыламі.
Ды як адарвацца ад зямлі
Касцёлам і цэрквам,

Пагадам і мячэцям,
Калі столькі грахоў
Пакідаюць людзі ў спавядальнях?

І раптам прымроіцца –
Храмы ўзляцелі!
І ўсё чалавецтва
Раз-пораз паглядвае ў неба,
Дзе лётаюць храмы,
Пазвоньваючы ў званы,
Прычашчаючы зоркі,
Прымяраючы месяц
На вострыя спічакі,
І дзіўна – усім даспадобы
Той экуменічны палёт.

***

Бог пайшоў,
І чаечае пер'е
Забяліла сінюю ваду.
